PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://www.kurier-poranny.com/niwa

№ 38 (2314) Год XLV | Беласток 17 верасня 2000 г. | Цана 1,50 зл.

З Пячораў — у Беласток

Людское сэрца — не камень

Ада Чачуга

На выгляд — дзеці здаровыя, ды і развітыя яны, калі з імі пагаворыш, веды маюць. Вось толькі душы ў іх хворыя, і няма ад гэтай хваробы ратунку. Адзіноцтва. Для ніводнага з іх не знайшлося месца ў бацькоўскай хаце. Жывуць у дзіцячым доме і не могуць разлічваць на ласкавы матчыны пацалунак на дабранач, ці на вылазку з бацькам на раку палавіць рыбу.

Нейкая трывога ў іх вачах, затоены сум і... надзея. Надзея на лепшую будучыню. Вера ў тое, што некалі скончыцца гэты кашмар сірочага жыцця. Сірочага, хаця рэдка хто з іх — сірата. Крыўда залівае іх сэрцы і мо дзе цішком нехта заплача, а іншы праглыне свае слёзы. Віду яны, аднак, не падаюць і пра свой лёс гавораць ужо спакойна, як старыя, быццам так яно і мела быць.

Дзеці прыехалі гэтым летам у Беласток з дзіцячага дома ў Пячорах, што каля Пскова.

Гаворыць **Анна Фіёнік** з Брацтва Трох Свяціцеляў у Беластоку, галоўная арганізатарка і апякунка дзяцей, па прафесіі выхавацельніца прадшколля:

У мінулым годзе мы былі ў паломніцтве ў Пячорах каля Пскова. Мы жылі ў жанчыны, якая дакармлівала дзяцей з дзіцячага дома. Дзеці заўсёды прыходзілі да яе пасля абеду. Былі галодныя, дык яна варыла ім бульбу. У дзіцячым доме ад раніцы да вечара елі кашу. Дзеці стараліся памагчы жанчыне, аддзякаваць неяк за тую бульбу. То прынясуць вады, то дровы з двара, то нечага нарвуць у агародзе. Гэта не была вялікая дапамога, бо і не надта яна была гэтай жанчыне патрэбная. Проста хацела яна накарміць галодных.

У снежні мінулага года мы сабралі грошы на малако дзецям. Грошы былі завезены ў Пячоры, і мы атрымалі квітанцыі за купленае малако.

На пасяджэнні праўлення нашага брацтва было вырашана прыняць летам у Беластоку групу дзяцей з пячорскага дзіцячага дома. Мы запрапанавалі гэта тамашняй дырэкцыі, і яны згадзіліся. Два ці тры разы мы ездзілі туды ізноў, дамаўляліся. Хто ехаў, заўсёды нешта везлі. На Каляды завезлі дзецям цацкі, цукеркі, іншыя салодкія вырабы.

Усё гэта нам далі спонсары, якіх мы пачалі шукаць, як толькі даведаліся, што прыедзе дваццаць дзяцей з двума апекунамі. У якія дзверы не пастукалі, ніхто не адмовіў. Фірмаў, ахвотных дапамагчы, было шмат.

Нашу ідэю запрасіць сюды дзетдомаўцаў з Пячораў браславіў уладыка Іакаў.

Людзі з брацтва ахвотныя былі браць дзяцей на пабыўку ў свае дамы,

[працяг ☞ 9]

Беларускія скарбы ў свірне.

Поўна хата экспанатаў

Міра Лукша

— Coś z tym fantem trzeba zrobić, — кажа Антоні Масевіч, захавальнік Музея сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы, кіраўнік аддзела энтаграфіі. Значыць, з экспанатамі, якія сёння, ад васьмі гадоў, звалены ў свіран чакаюць, каб прыехаў па іх „хтось з БГКТ” ды забраў туды, дзе іх месца. Гэта больш-менш усе тыя, якія былі забраны з Белавежы.

Экспанаты тыя пераехалі ў Цеханавец у той час, калі спадар Антоні яшчэ тут не працаваў. Але ёсць у яго ўся дакументацыя, тры папкі, спіскі, сшытак. Гэтыя зборы былі сюды прывезены рашэннем Акруговага музея ў Беластоку, у той дарэформенны час, калі Цеханавец быў яшчэ ў старым Беластоцкім ваяводстве. Тыя экспанаты былі перагледзены спецыялістамі і было сцверджана, што некаторыя экспанаты са збору не надаюцца, па прычыне знішчэння, ні да захоўвання, ні ў экспазіцыю. Рэшта (каля 600 штук) была загаспадарана...

— Праз хвіліну я вам іх пакажу, — кажа спадар Антоні і вядзе мяне ў адну з частак свірна, дзверы якіх пільнуе вулей-мядзведзь.

— Яны — захапляючыя з энтаграфічнага пункту гледжання, бо яны — уласнаручны выраб, — спадар Антоні бярэ ў рукі мянташку, відна, што ўжываную да вастрэння касы — такая прылада была ў паўсюдным карыстанні да канца XIX стагоддзя. — Бывае, што нідзе болей такіх не сустракаем. Экспанаты гэтыя былі выкарыстаны на розных экспазіцыях пастаянных (як хата беларуская, купленая са сродкаў Таварыства любіцеляў Цеханоўца ў Саках), дзе яны натуральна ўпісаліся ў інтэр'ер, на выставах рамяства. Іншыя, не кваліфікаваныя да інтэр'еру, як, напрыклад, прылада да гнуцця дуг ці колаў з аднаго кавалка драўніны, да торфу, былі паказаны ў іншых экспазіцыях. На пачатку дзевяностых гадоў ГП БГКТ стала даходзіць, што з экспанатамі, нават абвінавачваць Музей, што бяспраўна прысабечыў экспанаты з грамадскага беларускага музея, пісаць у міністэрства, ломжынскаму ваяводу. І тады мы ўсё, што было, апроч, вядома, беларускае хаты і таго, што проста немагчыма забраць з яе, бо было б гэта развалам экспазіцыі, спісалі (кожны з экспанатаў мае пазначэнні нашы і белавежскія) ды перанеслі сюды, у гэты свіран. І так чакаем восем гадоў, каб хто гэта забраў. Прыязджалі людзі з беларускага асяроддзя, нават вядомыя, дык нават не мелі ахвоты пабачыць, што тут ляжыць...

Праўда, не ліецца на эскпанаты дождж, але, папраўдзе, не ўлезці сюды нават рэстаўратару. Калі б былі яны да гэтай пары ў нейкіх экспазіцыях, напэўна выглядалі б лепш. А ўсё, што ў гэтай агромнай каморы свірна, на першы погляд — ламачча! Праўда, у невялікай кучцы ляжыць сапраўды не вельмі прыдатнае да ўжытку (хоць цікавае з прычыны таго, што гэта выканана чалавечымі руплівымі рукамі), ды рэшта, нават такія цуды як тая слявутая прылада да дуг, выглядае марна, бо як мае выглядаць! Усё гатова, разам з дакументацыяй, каб прыехалі беларусы і забралі. Вядома, спадару Масевічу і іншым працаўнікам Музея імя Кшыштафа Клюка сэрца баліць аддаваць усё тое, ды ўжо змірыліся. Шкада толькі, што гэтыя рэчы ляжаць тут без ніякай карысці. Час ад часу толькі нейкі экспанат напаўлегальна гасцюе на нейкай экспазіцыі, прызнаецца спадар Антоні. А тут ёсць яшчэ і скрыня з „анучамі” (строі не надаюцца да паказу), шмат чаго цікавага, што таксама можа змарнець...

[працяг ☞ 3]

Турызм — шанц для Белавежы

Нядаўна турыстычнае прадпрыемства „Nature Travel” з Беластока пачало будаваць у Белавежы гасцініцу з адпачынкова-канферэнцыйным комплексам. Прадбачваецца, што ў гасцініцы будзе 60 пакояў для 120 асоб.

[*планы* ☞ 3]

Іван Краскоўскі

Нарадзіўся ён 26 чэрвеня 1880 г. у Дубічах-Царкоўных Бельскага павета. Ён — сын святара — быў прадстаўніком тадышняй эліты. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. У пачатку XX стагоддзя пару гадоў працаваў у Кіеве. Быў адным з вялікіх прыхільнікаў захавання цесных беларуска-ўкраінскіх сувязей.

[*зямляк* ☞ 4]

Нарач — возера як сэрца

Дарога на Нарач паказалася цалкам прыемнай. Бясконцыя лясы, быццам бальзам, лагодзілі і супакойвалі прывезеную з Польшчы прэтэнцыёзнасць. Сцішка засмоктвала нас беларуская меланхолія і абыякавасць. Час ад часу сустракаліся групы маладзёнаў, прапануючы продаж вугроў і ракаў. Радзей траплялiся грыбнікі, наўздзіў усе ў спартыўных касцюмах.

[*падарожжа* ☞ 5]

Святa ў Чыжах

Заўсёды вялікім атракцыёнам з'яўляюцца гасцінныя выступленні калектываў з Рэспублікі Беларусь. Гэтым разам на заканчэнне багатай праграмы выступіў Ансамбль беларускай народнай музыкі „Гудскі гармонік” з Ліды.

[*дажынкі* ☞ 8]

Трагедыя Скірмунтаў

Аднойчы я была сведкай, як Сільвестр Лукашык падвыпіў і гаварыў: „Завялі мы іх і заставілі яму капаць. Раман адказаўся. Баляслаў малодшы быў, адразу спужаўся, зусім панік. Заўважыў гэта Скірмунт, абапёрся на сук і просіць: «Хутчэй рабіце што рашылі».

[*беззаконне* ☞ 10]

Арлянскія пажарнікі

У ходзе мерапрыемства пажарнікі спаборнічалі ў двух відах пажарна-прыкладнога спорту: пажарная эстафета з перашкодамі (7 х 50 м) і баявое разгортванне шлангаў. Першае месца з агульным часам 109,8 секунды заняла пажарная каманда з Орлі. На чарговых месцах апынуліся каманды з Рыгораўцаў, Градалёў і Рудутаў.

[*пераможцы* ☞ 11]

Беларусь — беларусы

Эканамічны форум у Польшчы

Імпульс для беларускіх прадпрымальнікаў

Завяршыўся эканамічны форум „Польшча — Усход", які на працягу трох дзён праходзіў у горадзе Крыніца-Гурска.

Беларусь на форуме прадстаўлялі 45 бізнесменаў — членаў Беларускага саюза прадпрымальнікаў. Дзелавую частку дэлегацыі ўзначальваў прэзідэнт БСП Уладзімір Карагін. Агулам у мерапрыемстве ўдзельнічала больш за 700 гасцей з 40 краін.

Асноўнай тэмай выступленняў і дыскусій на форуме стала падвядзенне вынікаў дзесяцігадовых рэформ, якія праводзяцца ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Пытанням „Якая будучыня Еўропы?" і „Дзяржава сацыяльна-арыентаваная ці ліберальная?" асаблівую ўвагу адвялі прысутныя на пленарных пасяджэннях прэзідэнты: Польшчы — Аляксандр Кваснеўскі і Літвы — Валдас Адамкус. Яны абодва выступілі з дакладамі на гэту тэму ў дзень адкрыцця форуму.

Новай тэмай у гэтым годзе было пытанне ўплыву глабальных сістэм мабільнай тэлесувязі на стымуляванне эканамічнага развіцця краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама роля Інтэрнэту ў еўрапейскай эканоміцы на парозе XXI стагоддзя і ў развіцці банкаўскай сістэмы. Удзельнікі таксама абмяркоўвалі, як і раней, праграмы прыватызацыі, ролю замежнага капіталу ў банках усходнееўрапейскага рэгіёна.

Многа ўвагі ў ходзе спаткання было адведзена 10-гадоваму вопыту пераўтварэнняў у Польшчы. Адбылася канферэнцыя „10 гадоў трансфармацыі дзяржаўнага ладу: як дзяліцца вопытам Польшчы і як яго выкарыстаць" і пленарная сесія „Роля і значэнне Польшчы ў еўрапейскай палітыцы на парозе XXI стагоддзя". Перад удзельнікамі выступілі старшыня Польскага нацыянальнага банка Ганна Гранкевіч-Вальц, намеснік міністра фінансаў Польшчы Кшыштаф Нэрс і шэраг польскіх палітыкаў і бізнесменаў.

У працы форуму актыўна ўдзельнічалі таксама члены беларускай дэлегацыі. Уладзімір Карагін выступіў з дакладам „Як з дапамогай грамадскага дыялогу развіваць эканамічны рост без ушчамлення вольнага рынку". Адбылася таксама прэзентацыя Беларускага саюза прадпрымальнікаў, гасцямі якой сталі больш за 400 удзельнікаў з Расіі, Украіны, Арменіі, Польшчы, Славакіі і іншых краін. Гасцям былі прадстаўлены дзелавыя прапановы і праекты, інфармацыйныя буклеты, даведнік „Беларусь-2000. Мы адкрыты для Вашага бізнесу". Вялікую цікавасць выклікалі праекты Адміністрацыі Свабоднай эканамічнай зоны „Мінск", Радашковіцкага керамічнага завода, Акцыянернага вытворчага таварыства „Белаграпрамсервіс", Магілёўскага металургічнага завода.

Паводле Уладзіміра Карагіна, юбілейны форум быў адным з цікавейшых і плённых. „Мы сустрэліся з вялікай колькасцю энергічных людзей — палітыкаў, бізнесменаў. Важна, што гэтыя спатканні прыдалі цалкам новы імпульс працы беларускіх прадпрымальнікаў. Частка з іх нават асталася ў Польшчы для ўстанаўлення далейшых кантактаў".

Ірына Міраклава

www.open.by, 8.09.2000 г.

Інструмент антыбеларускай палітыкі

У кастрычніку г.г. у Беларусі адбудуцца парламенцкія выбары. Стаўленне беларускай апазіцыі да іх неадназначнае. Быццам бы ўсе апазіцыйныя арганізацыі бачаць небяспеку сфальшавання выбараў і не вераць у шчырасць улад, якія робяць усё, каб далей мець свой кішэнны парламент, але з набліжэннем тэрміну галасавання расце колькасць апазіцыянераў гатовых уступіць у выбарчае змаганне за крэсла ў „палаце прадстаўнікоў". У гэтай справе кіраўніцтвы некаторых арганізацый прынялі саламонава рашэнне: сама арганізацыя не прымае ўдзелу ў выбарах, але дзеячам пакідаецца магчымасць балаціравацца як прыватным асобам. Больш радыкальныя арганізацыі, напрыклад, Беларускі народны фронт, узначальваемы Вінцуком Вячоркам, ці частка Аб'яднанай грамадзянскай партыі пачалі кампанію „Байкот-2000". Аднак рашэнне канферэнцыі АБСЕ ў Вене аб прысланні тэхнічных назіральнікаў ад Бюро па дэмакратыі і правах чалавека падарвала веру ў тое, што Захад не прызнае выбараў, нягледзячы на агаворку, што накіраванне назіральнікаў не абазначае яшчэ аўтаматычнага іх прызнання.

Найбольш прынцыповую і радыкальную пазіцыю ў справе выбараў сярод апазіцыйных згуртаванняў займае БНФ „Адраджэньне", кіраванае Зянонам Пазьняком, і ягоная Кансерватыўна-хрысціянская партыя — БНФ. Лічаць яны, што выбары ў „палату прадстаўнікоў" маюць на мэце легітымізацыю знішчэння беларускай дзяржавы і інкарпарацыю яе ў склад Расійскай Федэрацыі. У заяве, адрасаванай АБСЕ, абедзве арганізацыі са здзіўленнем сцвярджаюць, што некаторыя палітычныя колы Заходняй Еўропы, асабліва нямецкая дыпламатыя, спрыяюць расійскай акупацыйнай палітыцы ў Беларусі.

„Адным з інструментаў гэтай антыбеларускай палітыкі актыўна праявіла сябе Кансультатыўна-назіральная група АБСЕ ў Мінску, якую ўзначальвае нямецкі дыпламат сп. Ганс-Георг Вік, — напісалі аўтары заявы. — КНГ АБСЕ актыўна ўключылася ў працэс падрыхтоўкі выбараў у псеўдапарламент дыктатара. Сп. Вік і ягоныя супрацоўнікі ездзяць па ўсёй Беларусі, арганізуючы прапагандысцкую і падрыхтоўчую кампанію да псеўдавыбараў. Праз АБСЕ выдзелены значныя сродкі на прапаганду выбараў і падрыхтоўку назіральнікаў. Складваецца ўражанне, што АБСЕ спрыяе працэсам акупацыі Беларусі і пашырэнню Расійскай імперыі. Вынікам такіх дзеянняў можа быць толькі глыбокі палітычны крызіс у нашай краіне і дэстабілізацыя становішча ва ўсёй Усходняй і Цэнтральнай Еўропе".

У заяве БНФ „Адраджэньне" і КХП патрабуюць ад АБСЕ спыніць дзейнасць Кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ па прапагандзе і падрыхтоўцы псеўдавыбараў, не прысылаць на іх міжнародных назіральнікаў і змяніць кіраўніка КНГ у Мінску, паколькі „сп. Вік свае магчымасці ў Беларусі вычарпаў".

(вл)

Юбілей „Бацькаўшчыны"

7 верасня 2000 года ў Мінску прайшла прэс-канферэнцыя з нагоды 10-годдзя ўтварэння Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына". Само святкаванне юбілею Згуртавання адбудзецца 6-7 снежня г.г., адначасна з правядзеннем IV Міжнароднай канферэнцыі „Культура і адукацыя беларускага замежжа". Тады ж будзе праходзіць і пасяджэнне Вялікай Рады.

Ніжэй друкуем віншаванне для беларусаў Польшчы з нагоды 10-годдзя ЗБС „Бацькаўшчына".

Шаноўнае Спадарства!

Шчыра вітаем сяброў Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" і ўсіх рупліўцаў на ніве захавання беларускай прысутнасці ў свеце з 10-годдзем вашай адданай працы ў МГА ЗБС „Бацькаўшчына". Неацэннае значэнне мае гэтая падзея ў справе яднання беларускай нацыі. ЗБС сталася прыкладам адной з першых сапраўды дэмакратычных, заснаваных на шырокай грамадскай і нацыянальнай ініцыятыве арганізацый у постсавецкай, у посттаталітарнай Беларусі. Беларусы на Бацькаўшчыне і беларусы замежжа, незалежна ад поглядаў і перакананняў, аб'ядналіся дзесяць гадоў таму, каб сумеснымі намаганнямі паскорыць працэс нацыянальнага адраджэння, будаўніцтва суверэннай нацыянальнай дзяржавы.

Толькі ад нас беларусаў на Бацькаўшчыне і ў дыяспары — ад нашай мудрасці і самаахвярнасці, цвёрдасці і рашучасці залежаць дабро і мір, росквіт нашай Бацькаўшчыны. У штодзённай, жмудnай і непрыкметнай працы нараджаюцца вялікія справы, гартуецца наша воля, расце перакананасць, што Беларусь пратрывае цяжкія часіны, што Магутны Бог дапаможа беларускаму народу займець лепшую долю.

Зычым вам, суродзічы і землякі, моцнага здароўя, шмат сіл для добрай і плённай працы, памыснасці ва ўсіх справах.

Спадзяемся, што разам зробім шмат карыснага для Беларусі.

ЗБС жыве, ЗБС з надзеяй глядзіць у будучыню і шырока разгортвае сваю дзейнасць. Бо, як казаў наш пясняр Янка Купала, адкуль жыве хоць адзін беларус у свеце — жыве Беларусь.

Жыве Беларусь!

Прэзідэнт МГА „Бацькаўшчына"
Радзім Гарэцкі

Крайняя ўвага і зацікаўленасць

5 верасня г.г., у дзень адкрыцця Саміта тысячагоддзя, у якім удзельнічалі кіраўнікі дзяржаў-членаў ААН, на дзённым пасяджэнні Генеральнай асамблеі ААН выступіў прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Як адзначыла газета „Советская Белоруссия", у час выступлення прэзідэнта „рэжысёры трансляцыі паказалі, як слухалі выступленне Уладзімір Пуцін, Леанід Кучма, Мадлен Олбрайт: крайняя ўвага і зацікаўленасць". „Трэба сказаць, — піша згаданая „СБ", — што калі Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на саміце рабіў упор на калектыўную адказнасць краін свету за бяспеку, уключаючы і экалагічную (надта красамоўным быў прыклад аб чарнобыльскай бядзе), то расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін дакладна абазначыў толькі адну праблему — недапушчэнне мілітарызацыі космасу. Усе астатнія найбольш важныя праблемы сусветнага парадку былі сфармуляваны вельмі дыпламатычна".

Заходнія прэс-агенцтвы ў сваю чаргу, у тым ліку і ПАП, асаблівую ўвагу звярнулі на антызаходнія выказванні беларускага лідэра. У першую чаргу адзначылі яны факт, што Аляксандр Лукашэнка сваё выступленне пачаў з крытыкі НАТО за мінулагоднюю ваенную аперацыю ў Югаславіі. Падкрэсліў ён штораз меншую актыўнасць ААН у процідзеянні канфліктам у свеце і заявіў, што „пэўныя сілы" намагаюцца ўчыніць ААН інструментам для дасягнення сваіх мэт. Далей беларускі прэзідэнт абвінаваціў вялікія дзяржавы ў нахабстве і супрацівіўся падзелу свету на „настаўнікаў" і „вучняў".

Пасля выступлення Аляксандр Лукашэнка ў размове з журналістамі падкрэсліў важнасць таго, што „на такім прадстаўнічым форуме быў пачуты і голас Беларусі, дзяржавы, якая ў ліку шэрагу іншых краін стаяла ля вытокаў заснавання ААН".

Саміт тысячагоддзя меў больш сімвалічны, чым практычны, характар. Аднак для беларускага лідэра важным і каштоўным было тое, што даваў ён магчымасць сустрэч з кіраўнікамі іншых краін. Паводле Аляксандра Лукашэнкі, у ходзе „нефармальных кантактаў" кіраўнікі дзяржаў выказвалі цікавыя, часам нават арыгінальныя погляды на сусветны парадак. Са сваіх кантактаў кіраўнік Беларусі адзначыў „доўгую і шчырую размову з ізраільскім прэм'ер-міністрам Эхудам Бараком". Аляксандр Лукашэнка сустрэўся яшчэ з лідэрамі Алжыра, Бангладэша, Ірана і Турцыі.

Паводле электронных СМІ

Лукашэнка паляцеў услед за „качкай"

Больш за сто пяцьдзесят каралёў, генералаў, прэм'ер-міністраў і прэзідэнтаў правялі тры дні ў Нью-Йорку з 6 па 8 верасня. Гэтае буйнейшае ў гісторыі спатканне кіраўнікоў дзяржаў атрымала назву „саміт тысячагоддзя".

Саміт, як прынята, быў адзначаны скандаламі, кур'ёзамі і іншымі не менш цікавымі здарэннямі. (...)

Нечакана ў цэнтры ўвагі аказалася і беларуская дэлегацыя на чале з Аляксандрам Лукашэнкам. У ЗША нашы высокапастаўленыя асобы не загасцявалі. З лёгкай рукі Інтэрфакса па ўсім свеце разышлася і была хутка падхоплена вестка аб тым, што быццам бы Біл Клінтан выкрасліў беларускага прэзідэнта са спіскаў запрошаных на званы абед, а Аляксандр Лукашэнка ў адказ на гэта рашыў гучна грукнуць дзвярыма, спыніць свой візіт і пакінуць Штаты. Але гэтая інфармацыя аказалася толькі журналісцкай „качкай". Яшчэ а трэцяй гадзіне раніцы маскоўскага часу агенцтва ІТАР-ТАСС паведаміла, што, як раней планавалася, адразу пасля выступлення Аляксандра Лукашэнкі на саміце беларуская дэлегацыя адправілася ў Мінск, дзе на чацвер у прэзідэнта Беларусі запланаванае спатканне са старшынёю Пастаяннага камітэта Усекітайскага народнага схода Лі Пэнам. І гэта сапраўды так. Хаця „беларускі" скандал, бузумоўна, ажывіў бы хроніку візіту ў ЗША кіраўніка беларускай краіны. Трохі пазней ІТАР-ТАСС пацвердзіў, што Аляксандр Лукашэнка ўсё-такі, як і планавалася, адляцеў з Нью-Йорка ў Мінск. (...)

Аляксандр Уласкін

Белорусская деловая газета
№ 833 ад 8.09.2000 г.

Турызм — шанц для Белавежы

Самая вялікая будова — гасцініца прадпрыемства „Nature Travel”.

— Мы за аховай Белавежскай пушчы, але хочам, каб працэс пашырэння Белавежскага парку быў расцягнуты ў часе. Спачатку самаўрады павінны атрымаць урадавую фінансавую ўспамогу, якую можна было б папаўняць з ваяводскага бюджэту, — заяўляе войт белавежскай гміны Станіслаў Куявяк. — Зараз вядуцца размовы з ваяводаю і Ваяводскім сеймікам, каб стварыць урадавую праграму развіцця Белавежы.

У гміне Белавежа, распаложанай на тэрыторыі больш за 20 тысяч гектараў, дзе большую частку састаўляе лес, жыве каля 3 тысяч жыхароў. Многа тут беспрацоўных (зарэгістраваных 12%), а вялікая колькасць людзей атрымлівае зарплату памерам у 600 злотых. Маладыя павыязджалі за працай у гарады і цяпер мала прадстаўнікоў сярэдняга пакалення. Хаця вучыцца яшчэ каля 370 дзяцей, то ў Падставовай школе працуюць ужо толькі па адным першым і другім класах. Войт Станіслаў Куявяк інфармуе, што на працягу года ў Белавежу прыязджае каля 100 тысяч турыстаў, якім летам трэба падрыхтаваць каля 2 тысяч начлежных месцаў. У гміне Белавежа ў некалькіх гасцініцах, 2 пансіянатах (на 70 месцаў) і 40 агратурыстычных кватэрах можа пераначаваць каля 450 асоб. Астатнія шукаюць начлегу ў суседніх гмінах. Для турыстаў патрэбны рэстараны, сталовыя і іншая інфраструктура для адпачынку.

Турызм — шанц развіцця Белавежы

Нядаўна турыстычнае прадпрыемства „Nature Travel” з Беластока пачало будаваць у Белавежы гасцініцу з адпачынкова-канферэнцыйным комплексам. Ужо зараз белавежскі аддзел гэтага прадпрыемства арганізуе адпачынак на веласіпедах для замежных турыстаў. Прадбачваецца, што ў гасцініцы, якая пачне працаваць у пачатку 2002 года, будзе 60 пакояў, у якіх зможа пераначаваць 120 асоб. У будучыні плануецца будова крытага басейна. У апошні час штораз больш людзей ва ўсёй гміне прапануе начлег і іншыя паслугі ў агратурыстычных кватэрах, а па вуліцы Застава ў Белавежы будуецца новы пансіянат. У 2002 годзе плануецца закончыць рамонт гасцініцы „Іва”, хутка распачнецца перабудова гасцініцы „Зуброўка” і ўжо выдадзены дазвол на будову гасцініцы па вуліцы Крыжы. Вядуцца таксама размовы з інвестарамі, якія хочуць будаваць гасцініцы побач чыгуначных вакзалаў. Зараз павысіліся цэны на прыватныя дамы і на зямлю пад жыллёвую будову (7-10 долараў за квадратны метр).

Плануецца ў хуткім часе прыстасаваць рэчку Нараўку да патрэб байдарачнікаў, а ў стратэгіі развіцця Белавежы запланавана будова залівa велічынёй да 5 гектараў, які мог бы быць распаложаны паміж вуліцамі Паркавай і Мастовай. Пры Падставовай школе знаходзіцца спартыўная зала на 300 гледачоў, але для турыстаў патрэбныя таксама спартыўныя пляцоўкі для летніх гульняў і дадатковыя сцежкі для веласіпеднага турызму. Іх будова не распачнецца ў бліжэйшым часе з-за недахопу грошай у гмінным бюджэце. За Пагарэльцамі знаходзіцца гадоўля верхавых коней да язды па лесе, але іх яшчэ малавата. У гміне Белавежа турыстам прапануецца 20 брычак і шмат веласіпедаў. Зараз намаганнем павятовых улад у Гайнаўцы ўзнікае Цэнтр турыстычнай інфармацыі па Гайнаўскім павеце. Робяцца таксама захады, каб стварыць такі цэнтр у Белавежы для лепшага ўзгаднення інфармацыі пра начлежныя месцы і магчымасці харчавання ў Белавежскай гміне. Час ад часу адкрываецца турыстычны пераход з Беларуссю і жыхары прыгранічных мясцовасцей могуць наведваць сваіх сваякоў за мяжою. Цяпер вядуцца намаганні адкрыць пастаянны турыстычны пагранпераход. У стратэгічных распрацоўках прадбачваецца, што будова новых гасцініц, пансіянатаў, агратурыстычных кватэр і развіццё турызму ў гміне дадуць новыя месцы працы для амаль 1 000 асоб, што і дазволіць вырашыць пытанне беспрацоўя ў Белавежскай гміне.

Гмінныя інвестыцыі

Для развіцця турызму патрэбна разбудова тэхнічнай інфраструктуры, якая вядзецца, у галоўным, за кошт гміннага бюджэту і датацый. У гміне Белавежа ў 1996 годзе здалі ў карыстанне ачышчальню сцёкаў і з гэтага часу многа сродкаў паглынае каналізацыя. У мінулым годзе каналізацыйную сетку атрымалі вуліцы Вашкевіча, Трапінка, Застава, Крыжы, а водаправод давялі ў Буды. У гэтым годзе праклалі асфальт на павятовай вуліцы Застава і будуць рабіць там тратуары. Памянялі таксама вугальнае ацяпленне на алейнае ў Падставовай школе і Гмінным асяродку культуры, куды перанесены быў нядаўна гмінны адміністрацыйны цэнтр. Канчаецца таксама будова будынка для Гміннай дабраахвотнай пажарнай аховы.

Пансіянат „Унікат” у Белавежы.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Поўна хата экспанатаў

[**1** ☞ *працяг*]

— Усё, значыць, усе экспанаты? — пытаюся. — Шэсцьсот ужыткаваных, эвідэнцыянаваных?

У святым куце хаты дзядоў Міхася Шаховіча з Сакоў.

— Мы не згодзімся на зварот усіх беларускіх экспанатаў, бо яны ў 99 працэнтах на абсталяванні беларускае хаты. Яны мусяць там застацца. А гэтых, падрыхтаваных да звароту — тут каля 360 штук, з іншых экспазіцый можна ўзяць яшчэ трохі, і ўсяго будзе гэта каля 400 штук. — Тут спадар Антоні вяртаецца да тэмы, што трэба паказваць (бачыў, ці не ў „Ніве”, што на пачатак паказвалася ў Беларускім музеі): — Сваё. Не віцебскія скарбы, а нашыя, тутэйшыя. Людзям цікава, што насілася калісь у сваёй, у суседняй вёсках. Калі не мелі, маглі б нават у Беластоку ўзяць, ці ў нас пазычыць. Моладзь з-пад Бельска прыязджала, зрысоўвалі, здымалі ўзоры з беларускага адзення, каб пасля выступаць. У палацы мы паказвалі беларускае святочнае адзенне, на выстаўцы (якраз вярнулася з Ломжы) „У кухні і каморы” — беларускія ручнікі ў пеўнікі, крыжыкам вышываныя… Адна прыгажосць.

Спадар Антоні вядзе мяне да беларускае хаты, шчытом да вуліцы, абсталяванай беларускімі экспанатамі — купленымі музеем перш за ўсё з уласных сродкаў. За хатай — агарод, збоку — загоны, пад хатай — тыповы, сціплы агародчык з жоўтымі вяргінямі... Сені, ізба з кухняй, направа камора. Самае цуда — палявая калыска, адзіны такі экспанат з усіх 9 200 энтаграфічных у музеі!

У гэтым пакоі была пастаўлена „Boża podszewka” Ізабелы Цывінскай. Тая сцэна, калі галоўная гераіня б’е мужаву каханку, Валюню, чапялой. У сцэнарыі была тая чапяла, і рэжысёрка, хоць сама этнограф, мусіла пытацца ў спадара Антона, родам з-пад Ліды, што гэта такое. А ён, кажа, у генах гэта мае. І мову памятае, хоць, не ўжываючы, можна забыцца. Калі была экскурсія з універсітэта, з Латышонкам, захацелі, каб іх вадзіў ды паказваў усё ў музеі па-беларуску. Дырэктар Казімеж Ушынскі слухаў ззаду, ды кажа: „Co ty gadasz, Antoni, że to po białorusku, przecież ja wszystko rozumiem!” Ну, гэта ж не кітайская мова, чаму меў яе не разумець паляк?

Беларуская хата цешыцца неверагодным поспехам у наведваючых музеў. Кажуць: такая экзотыка, гэтае праваслаўе! Проста балдзеюць. Ага, не тутэйшыя яны, а з іншых рэгіёнаў Польшчы ды замежнікі.

Міра Лукша
Фота аўтара

— Такімі мянташкамі карысталўся паўсюдна, — паказвае захавальнік Антоні Масевіч.

На поўдзень. Венгрыя

Калі ты не бачыш кафедры ў Эстэргаме, дык падышоў заблізка або ты ў іншым горадзе.

(заканчэнне;
пачатак у папярэнім нумары)

Будапешт уражвае даволі рэдкім спалучэннем каралеўскай велічнасці з гандлёвай, прадпрымальніцкай мітуснёй. Сядзіба венгерскіх каралёў — Буда — распаложана на гарыстым правым беразе Дуная. З каралеўскіх палацаў і рассеўшыхся на схілах маляўнічых узгоркаў вілаў цудоўная панарама на другі бераг ракі — мяшчанскі Пешт, цэнтр якога быў пабудаваны на зломе XIX стагоддзя, у часы інтэнсіўнага развіцця капіталістычнай гаспадаркі Аўстра-Венгрыі. Панараму ўпрыгожваюць сем мастоў перакінутых цераз Дунай, прычым кожны іншы, у кожным як быццам душа ягонага будаўніка. Заўсёды, калі я гляджу з Буды праз Дунай на Пешт, у мяне з'яўляецца жаданне застацца тут жыць — штодзень мець перад вачыма такі краявід і якіхсьці дзесяць мінут пехатою ўніз да мітуслівага цэнтра двухмільённай метраполіі.

Пешт шмат у чым нагадвае Парыж: шыкарныя камяніцы, выстраеныя ўздоўж шырокіх бульвараў, (з найпрыгажэйшым — Андрашы, які вядзе з цэнтра да Плошчы Герояў, месца дзяржаўных цырымоній і вайсковых парадаў), прытульныя вулічкі з кавярнямі, цукернямі (cukraszda), піўнушкамі (sorozo) і віннымі склепамі (borozo). Падобны ліберальны дух, што заўважаецца хаця б у час наведвання святыняў — ніхто не ганяе за кароткія штонікі ці майкі без рукавоў. А які тут рух!

Дынамізм горада, аднак, можа для турыста мець і свае адмоўныя бакі. Я, напрыклад, у цэнтры не знайшоў паловы вядомых мне бараў, дзе пару гадоў таму харчаваўся. Іх месца занялі банкі, гандлёвыя карпарацыі або багацейшыя рэстараны. Што ж, такая цана развіцця горада.

У Будапешце столькі музеяў і аб'ектаў, якія варта пабачыць, што без вострага адбору не абыдзецца. Нацыянальны музей, у якім, між іншым, захоўваюцца рэгаліі пачаткаў вянгерскай дзяржавы, Мастацкі музей, у якім знойдзеце ладную падборку італьянскага рэнесансу, Кафедра Святога Сцяпана, з купала якой ўбачыце маляўнічыя дахі горада, Опера з духам каралевы Сісі, неагатычны Парламент, фасад якога адбіваецца ў люстры Дуная... Ужо толькі гэтага досыць прынамсі на два дні.

Калі паедзеце з дзецьмі, абавязкова трэба адвесці дзень на востраў Святой Маргарыты. Перапынак ад турыстычнай спешкі ў шматлікіх басейнах з атракцыёнамі будзе прыемны таксама дарослым.

Ежа

Прычынай не менш прыемных уражанняў можа быць венгерская кухня. Мы рашыліся за рэкамендацыяй польскага журналіста Тадэвуша Альшанскага, выдатнага знатака Венгрыі, наведаць рыбны рэстаран Шыпош па вуліцы Лаяш 46 (квартал Абуды). Рыбным супам (halaszle) можа наесціся дарослая асоба, а талерка розных гатункаў смажанай рыбы хапае для двух. За абед на пяць чалавек, з віном, у гэтым даволі элегантным месцы заплацілі мы каля 150 злотых. У Варшаве было б тры разы даражэй.

Пакінуўшы Будапешт можна паесці яшчэ танней і не менш смачна. Пра мясцовую кулінарыю варта пытацца ў турыстычных цэнтрах, дзе заўсёды ёсць зычлівая асоба, якая гаворыць па-ангельску. Працаўніца такога офіса ў Эстэргаме рэкамендавала нам рэстаран „Пад залатым сланом", якога б мы ніколі не знайшлі ў несамавітым завулку. Цыганская печань і марынаваны жоўты перац добра кампанаваліся з трохгадовым вядомым напоем „Эгры Бікавер". Абавязкова трэба скаштаваць супы — рэкамендую бульён з кускамі пячонкі — і бліны (palacsinta), выбар якіх надзвычай багаты: з сырам, смятанай, шакаладам, арэшкамі, мігдалямі і рознымі іншымі бакалеямі. Як той казаў, ежа была вельмі тлустая, вельмі нездаровая, а значыць — надзвычай смачная. А пры тым усім, на ўспомненую кампанію каштавала якіх 70 злотых.

Краявіды

У даведніку *Pascala* чытаем: „Калі ты не бачыш кафедры ў Эстэргаме, дык або падышоў заблізка, або ты ў іншым горадзе". Эстэргам гэта першая сталіца мадзьяраў, а сёння — сядзіба венгерскіх прымасаў. Пабудаваная ў XIX стагоддзі кафедра — найбольшая святыня Венгрыі. Варта зайсці ў ейны скарбец са свецкімі і духоўнымі каштоўнасцямі, як і ўзабрацца на купал і паглядзець на Дунай, за якім ужо Славакія.

Перабрацца на другі бок можна толькі паромам, бо ўзарваны ў вайну мост ніхто так і не адбудаваў. Гэта таксама цікавая прыгода, асабліва калі ў той сам час уздоўж Дуная плыве аграмадная баржа з грузам, якая, здаецца, вось-вось урэжацца ў паром. Нічога такога, вядома не здарылася і мы шчасліва перабраліся на славацкі бераг. Паром адыходзіць кожную гадзіну. За легкавушку з камплектам пасажыраў трэба заплаціць прыблізна 15 злотых.

Па дарозе з Будапешта ў Эстэргам не прапусціце Сентэндрэ — мястэчка паэтаў, мастакоў, кавярняў. Заснавалі яго сербы, якія ўцякалі з Балканаў ад туркаў. Назва значыць папросту Святы Андрэй. Найстарэйшым помнікам архітэктуры з'яўляецца сербская царква, а пры галоўным паркінгу павітае вас адчыненымі дзвярыма і славянскімі спевамі сербскі рэстаран. Над прылаўкам сцяг і двухгаловы арол. У краіне НАТО такое мілае сэрцу кожнага праваслаўнага з Беласточчыны.

Некалькі кіламетраў далей чарговая сталіца — Вышаград. Варта ўзабрацца пакручастай шашой на гару. Краявіды тут такія, што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць. І можаце адчуць сябе як за караля Мацея Корвіна (XIV ст.), бо турыстычная машына пераносіць нас менавіта ў гэтую эпоху.

Хоць на адну ноч варта затрымацца ў адным з наддунайскіх пансіёнаў. Цэны ў гэтай ваколіцы ўдвая ніжэйшыя чымсьці ў Будапешце, а маладым віном пачастуюць вас амаль бясплатна. Добра сядзіцца са шкляначкай на балконе, да позняй зорнай ночы, пад музыку цвыркуноў...

Мікола ВАЎРАНЮК

Фота Аліны ВАЎРАНЮК і аўтара

У Вышаградзе можаш адчуць сябе каралём.

Іван Краскоўскі

Мінула 120 гадоў з дня нараджэння і 45 з дня смерці нашага вялікага земляка Івана Краскоўскага. У „Ніве" пісалі пра яго Мікола Гайдук і Алег Латышонак. Сёння з нагоды юбілею яго нараджэння варта ўспомніць імя выдатнага чалавека, якога выдала Беластоцкая зямля.

Нарадзіўся ён 26 чэрвеня 1880 г. у Дубічах-Царкоўных Бельскага павета. Ён — сын святара — быў прадстаўніком тадышняй эліты. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. У пачатку XX стагоддзя пару гадоў працаваў у Кіеве ў мясцовым Земскім саюзе. Добра пазнаў украінскую культуру. Быў адным з вялікіх прыхільнікаў захавання цесных беларуска-ўкраінскіх сувязей. З 1906 г. стаў членам Беларускай сацыялістычнай грамады. Як усе маладыя адукаваныя людзі тае эпохі верыў, што сацыялізм можа вырашыць усе чалавечыя праблемы, у тым ліку і беларускія. У якасці прадстаўніка беларускіх нацыянальных арганізацый паказаўся на з'ездзе народаў Расіі ў Кіеве ў верасні 1917 г. Шмат яго ўкраінскіх сяброў арганізавала тады Украінскую Народную Рэспубліку. Краскоўскі — чалавек з вялікім вопытам у адміністрацыйнай працы — стаў нават членам урада першай украінскай дзяржаўнасці.

Польска-савецкая вайна спыніла існаванне як Беларускай, так і Украінскай Народай Рэспублікі. У 1920 г. Іван Краскоўскі прыехаў у Вільню і нанава ўключыўся ў беларускую дзейнасць. Стаў старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэта. Пасля падпісання Рыжскага дагавора Краскоўскі выехаў у Латвію. Там уключыўся ў арганізацыю беларускага асветнага і культурнага жыцця. Дзякуючы яго намаганням у Дзвінску была адкрыта Беларуская дзяржаўная гімназія. Стаў яе першым дырэктарам. Краскоўскаму ўдалося таксама сабраць у гэтай гімназіі выдатных настаўнікаў, беларускіх інтэлектуалаў, якія, як і ён, уцяклі з акупаванай Беларусі. Дзвінская гімназія праводзіла навучанне амаль на універсітэцкім узроўні. Варта толькі адзначыць, што апрача беларускай вывучаліся там у якасці абавязковых лацінская, нямецкая, руская і латышская мовы.

У 1925 г. Іван Краскоўскі паверыў прапагандзе бальшавікоў і, як большасць беларускіх палітычных эмігрантаў, вярнуўся ў Мінск будаваць нацыянальнае жыццё ў сваёй краіне. Разам з земляком Усеваладам Ігнатоўскім стваралі Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускі інстытут культуры, а пасля Беларускую акадэмію навук. Працаваў выкладчыкам у гэтых установах. Пры канцы дваццатых гадоў стаў нават высокім чыноўнікам у дзяржаўнай адміністрацыі БССР.

У 1930 г. расійскія бальшавікі вырашылі, аднак, спыніць развіццё нацыянальнага жыцця ў Беларусі. Беларускім інтэлектуалам месца вызначылі ў турмах і сібірскіх канцлагерах. Іван Краскоўскі, як выдатны прадстаўнік беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, не меў ніякіх шанцаў пазбегнуць праследавання. У савецкіх турмах і ссылках праседзеў, з невялікімі перапынкамі, амаль дзесяць гадоў. Пасля вайны савецкія ўлады дазволілі яму выехаць у Чэхаславакію, дзе пражывала частка ягонай сям'і. У Беларусь ніколі ўжо не вярнуўся. Памёр 23 жніўня 1955 г. У 1988 г. саветы прызналіся, што трымалі яго ў турмах цалкам беспадстаўна.

Яўген МІРАНОВІЧ

Нарач — возера як сэрца

Возера Нарач.

Нядзеля ў Маладзечне паказалася як звычайны, поўны мітусні, працоўны будзень. У горадзе жыва вылучаўся адзін напрамак — дарога на рынак! Не пытаючы дарогі, разам з хваляй натоўпу мы трапілі на гарадскі базар. Можна купіць і прадаць тут усякую усячыну: бульбу, гародніну, збожжа, абутак, мяса, карціны, сабак...

Уражваў прыбіты, вялы настрой гандлю. Без духа вынаходлівасці, ініцыятывы. Ніхто ўголас не захвальваў нам свайго тавару, не хапала назойлівасці і агрэсіі, так характэрнай для нараджаючагася капіталізму.

У чым заключаецца прыцягальная сіла такога нясмелага гандлю, гадалі мы, праціскаючыся між мяшкамі і вядзерцамі з капустай і агурцамі. Ці не ў жыццёвай неабходнасці грамадзян, вядучых прыватную вайну за выжыванне? Цана прадуктаў прапанаваных дзяржаўнымі магазінамі шакіруе. Кілаграм каўбасы каштуе там 3-5 долараў, сала — 2 долары, хлеб — 20 цэнтаў, прычым тыповая беларуская зарплата вагаецца ў межах 20-30 долараў.

У Маладзечна прыехалі мы з канкрэтнай мэтай, — паснедаць ды паглядзець краязнаўчы музей. Рэстаран, куды завіталі мы з надзеяй папіць араматнай кавы, яшчэ не працаваў. Таксама не пашанцавала з музеем, які адкрываюць толькі ў працоўныя дні. У бары каля рынку, дзе сядзелі адно мужчыны, пахла кіслым гурком. Сам горад не захвочваў да бліжэйшага знаёмства. Было нават прыемна пакідаць Маладзечна. Па дарозе папалася на вочы калона адслужыўшых сваё грузавікоў і камбайнаў, абазначаных лозунгам — „Ураджай 2000”!

* * *

Дарога на Нарач паказалася цалкам прыемнай. Бясконцыя лясы, быццам бальзам, лагодзілі і супакойвалі прывезеную з Польшчы прэтэнцыёзнасць. Сцішка засмоктвала нас беларуская меланхолія і абыякавасць. Час ад часу сустракаліся групы маладзёнаў, прапануючы продаж вугроў і ракаў. Радзей трапляліся грыбнікі, наўздзіў усе ў спартыўных касцюмах.

Здзіўляла нас крыху гэтая гандлёвая актыўнасць ля шашы, бо знаходзіліся мы ў межах Нарачанскага нацыянальнага парку. Запаведнік існуе з 1999 года, займае плошчу 94 тысячы гектараў. Апрача возера Нарач і навакольных лясоў, парк уключае ў свой састаў азёры Мястра, Баторын, Мядзел, Балдук, Свір, Вішнеўскае, Малая і Вялікая Швакшта.

На Нарач дабіраемся ад мясцовасці Занарач. На асфальтаванай вуліцы дзенідзе сохне раскінутае сена. У вёсцы цішыня і бязлюддзе. З дапамогай мясцовага дзядзькі знаходзім добрае месца для купання. Але пакуль да вады — момант захаплення. Нарач падабаецца інакш як усе раней вядомыя азёры. Яго вабнасць засакрэчана ў дастойнай прастаце і адкрытасці. Сваім кшталтам падобнае яно на чалавечае сэрца.

* * *

Уваходзім у хвалі возера і зразу сюрпрыз! Мала таго, што празрыстая вада пахне аерам і рыбай. Пад нагамі сцелецца мяккі, ласкавы пясок. Лагодны бераг запрашае ў далёкі шпацыр па возеры. Менавіта... ідзем уперад дзвесце, трыста, чатырыста метаў... а вады ўсё па калена. Побач востpава, парослага трысцём, пялёскаецца дзікае птаства. Між хвалямі— прызабытая старая лодка. Здарожаны вандроўнік можа прысесці ды нават прылегчы ў гасцінным возеры. Нельга толькі аглядацца назад, у бок вёскі Занарач, дзе палохае архітэктурнае кашмарышча.

Улічваючы памеры, Нарач (займае 8 тысяч гектараў, даўжыня: з захаду на ўсход 13 кіламетраў, з поўначы на поўдзень 10 кіламетраў, максімальная глыбіня 25 метраў) называюць беларускім морам. На берагах і паўвостравах выступае характэрная марскім узбярэжжам расліннасць, між іншым, карлікавая сасна. Цікавасць выклікаюць таксама разнавідныя тыпы берага: пясчаныя пляжы, бераг з валунамі і стромымі кліфамі або багністая недаступная дрыгва.

У прыбярэжным лесе знаходзім сляды ваенных траншэяў і акопаў, што прызывае рэха бамбардзіровак, ваеннага кашмару. Такі беларускі кактэйль на развітанне з боскім возерам Нарач. Соль табе ў вочы!

* * *

— Нічэво не палучыцца, чайнік сламалса! — інфармуе нас абыякавым тонам барменка ў мястэчку Нарач, куды заехалі папіць кавы.

Сам цэнтр прадстаўляе сціплую, не надта вабную карціну. Бела-шэрыя муравanкі напераменку з хаткамі-небагаткамі, лужы, некалькі дрэў на месцы колішняга рынку, сонныя, прыбітыя нудотным жыццём і доляй жыхары. На касцельным пляцы мінаем мужчын, прысеўшых на кукішках. Гадаем, чаму гэтая нявыгадная пастава такая папулярная ў беларускім краявідзе. Ці сімвалізуе яна дастойны момант перад узлётам... ад рэчаіснасці?! Як правіла, практыкуюць яе грамадзяне з чырвонымі насамі.

Наведваем нешматлікія тут архітэктурныя помнікі: мураваную каменную царкву і касцёл св. Андрэя ў стылі несапраўднай готыкі. Дзверы касцёла адкрывае брат Дымітр, паслушнік манастыра кармелітаў босых. Будынак ордэна, вядомага сваёй сціпласцю і ўбоствам, адзін з самых відных і дагледжаных у мястэчку. Там жа і памяшканне Саюза палякаў.

— Старэйшыя прыхаджане не хочуць беларускай мовы ў касцёле. Яны — абаронцы польскасці і польскай мовы, — кажа найперш па-руску, далей па-польску і ўрэшце па-беларуску паслушнік Дымітр, сам родам з Нясвіжа. — А моладзь... па-рознаму ўспрымае беларускія багаслужбы. Для многіх гэта родная мова.

Каштоўнасць парафіі становяць абраз Анельскай Божай Маці і старыя арганы. Побач касцёла драўляная званіца XVIII стагоддзя і крыж Straży Mogił Polskich пастаўлены ў 1992 годзе ў гонар Арміі Краёвай.

Брат Дымітр абдароўвае нас на дарогу святымі абразкамі і культурна-рэлігійным беларуска-рускім часопісам „Дыялог”. У зваротнай дарозе зноў сустракаем дзядзькоў на кукішках. У адрозненні ад іх маем магчымасць хутка развітацца з пасёлкам Нарач, вядомым да вайны як Кабыльнік!

Ганна Кандрацюк

Фота аўтара

У пасёлку Нарач.

Першае верасня ў Бельскім белліцэі

Новы школьны год пачаўся традыцыйна 1 верасня каля 9 гадзіны раніцы. Пасля малебна ва ўсіх бельскіх цэрквах, дзеці і моладзь разышліся па сваіх школах. У беларускім ліцэі новы этап жыцця пачало 175 вучняў. Прыйшлі яны ў ліцэй не толькі з бельскіх падставовых школ але і з вясковых, напрыклад, з Мілейчыч, Кленік, Ягуштова, Кляшчэль ці Чаромхі. Традыцыйна найбольш кандыдатаў паходзіць з бельскай Падставовай школы н-р 3. Такая вялікая лічба кандыдатаў давяла да таго, што паўстала пяць першых класаў — усе па 35 асоб.

Паводле дырэктара ліцэя Зінаіды Навіцкай, у гэтым годзе ў ліцэі будзе вучыцца рэкордная ў гісторыі ліцэя лічба моладзі — 600 асоб. У час канікул ліцэй, як і яго дырэктар не адпачывалі. За два месяцы ў школе рабочыя аднавілі знішчаныя раздзявальні і мэблю. І найважнейшае — школа падключылася да Інтэрнэту. Цяпер, — гаворыць дырэктар ліцэя, — у любую пару дня і ночы і як доўга схочам можам карыстацца Інтэрнэтам. Цяпер у школе ўсё камп’ютэрызаванае, нават праца школьнага сакратарыята.

У школе апрача новых вучняў з’явіліся новыя настаўнікі — выкладчыкі польскай і англійскай моў ды гісторыі. Усе настаўнікі з аптымізмам пачалі новы школьны год. Напрыклад, настаўніца матэматыкі Анна Ткачук з усмешкай на твары вітала сваіх сяброў па рабоце і жадала ім поспехаў і цярплівасці ў новым годзе.

На спатканні настаўнікаў і вучняў у спартыўнай зале можна было пабачыць страх у вачах першакласнікаў і самаўпэўненасць старэйшай моладзі. Аднак прамова дырэктар Зінаіды Навіцкай у нейкай ступені супакоіла першакласнікаў. Большасць з іх напэўна не ўяўляе сабе магчымасцей, якія стаяць перад імі і якія дае вучоба ў Бельскім белліцэі.

Аднак баяцца яны крышку новай школы. Можна было пачуць, між іншым, і такія пытанні: як будзе ў новай школе, як нас прымуць старэйшыя класы, якімі акажуцца новыя настаўнікі, новае асяроддзе? На гэтыя пытанні можна адразу адказаць: добра! Беларускі ліцэй — гэта школа, дзе не толькі настаўнікі, але і самыя вучні дбаюць пра атмасферу. У новай школе напэўна памогуць першакласнікам прыстасавацца самі ліцэісты, сярод якіх ёсць групка старшакласнікаў, моцна звязаных з беларускай школай. Яны — візітная картачка ліцэя. Гэта Жанэта Роля, Мажэна Жменька, Тамаш Суліма і Міхась Сцепанюк. Яны, пры дапамозе Алега Кабзара, стварылі кабарэ „Куль”. Самадзейнікі з белліцэя супрацоўнічаюць з Дарафеем Фіёнікам пры выдаванні двухмесячніка „Бельскі гостінэць”. Некаторыя школьнікі пішуць артыкулы ў „Зорку”. Вучні II класа разам з вучнямі Гайнаўскага белліцэя арганізуюць рэйды і падарожжы па Беласточчыне.

Новы год пачаўся б бестурботна, калі б не праблема з заламі для навучання, якіх папросту бракуе. Каб не працаваць у суботы, трэба было шукаць памяшканняў у суседзяў. Белліцэю бракуе 4 залы. Ліцэй налічвае 18 аддзелаў, а ў школе толькі 14 залаў. Праблему часткова вырашылі заняткі рэлігіі, якія будуць адбывацца на плябаніі Прачысценскай царквы. Горш выглядае справа з раздзявальняй. Чацвёртыя класы з-за браку месца будуць раздзявацца на калідоры. Аднак, нягледзячы на ўсялякія складанасці, педагагічны калектыў з аптымізмам пачаў новы школьны год. „Напэўна справімся з цяжкасцямі. Усё будзе добра, як заўсёды”, — заявіла дырэктар ліцэя Зінаіда Навіцкая.

Паўліна Шафран

Зорка

СТАРОНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

I „ц” клас з бацькамі. Фота Міраслава СЦЕПАНЮКА

Вершы Віктара Шведа

Дапамажы рашыць задачу

Просіць сыночак блізкі плачу:
— Мой даражэнькі татулёк,
Дапамажы рашыць задачу,
Трэба ж на заўтрашні урок.

— Не прабаваў жа ты, няўмека,
Задачу гэту сам рашаць?
— Дасведчанага чалавека
Рашыў я лепей запытаць.

Ужо Вася ў пятым класе

— Я нядаўна дзённік сына
З недаверам паглядзеў
І праз нейкую хвіліну
Ледзь ужо не абамлеў.

— Можа неслухмяны Вася
Двоек многа прывалок?
— Не, у пятым ужо класе
Вучыцца цяпер сынок.

Першакласнікі з Беластока

Ужо чацвёрты год вядзецца навучанне беларускай мове ў Пачатковай школе н-р 4 у Беластоку. Заняткі роднай мовы тут з першага класа. Большасць навучэнцаў складаюць выпускнікі беларуска-польскага дзіцячага садзіка. У 2000/2001 навучальным годзе беларускай мове будзе вучыцца за трыццаць дзяцей. Цікава, што рады навучэнцаў папаўняюць не толькі першакласнікі. У IV „ц” клас дайшлі дзве асобы — спецыяльна, каб вывучаць беларускую мову. Гэта Каміля Севастыянік (яе брат Мацвей у другім класе) і Пятрусь Стэльмашук (выпускнік беларускага садзіка).

Наша рэдакцыя прысутнічала ва ўрачыстым адкрыцці новага года для першакласнікаў. Тут жа сустрэла сваіх старых знаёмых з прадшколля: Ганку Пякарскую, Тамашка Максімюка, Ярка Якацюка, Міколку Стшэльчыка, Олю Сцепанюк і Олю Заборскую. Нашы першакласнікі, хаця прыйшлі з бацькамі і бабулямі, не маглі нацешыцца пасляканікульнай сустрэчай. Яны весела гаманілі, не паказваючы хвалявання ад першага дня ў школе. Некаторыя з іх хадзілі трымаючыся за ручкі, а пасля згодна селі за парты. Усе названыя дзеткі вучацца ў I „ц” класе, іх выхавацелька — Ева Данейка. Урокі беларускай мовы павядзе Аліна Ваўранюк. З-за вялікай колькасці ў класе праваслаўных, лік навучэнцаў беларускай мовы павялічыцца. Самы станоўчы прыклад для бацькоў — усе старэйшыя навучэнцы беларускай мовы — цікавыя індывідуалы, акцёры, выдатнікі!

Зорка

У садку

Чарговы год пачаліся заняткі ў Самаўрадавым дзіцячым садку н-р 14 у Беластоку (дырэктар Ева Шыманская), у якім працуюць дзве беларускія групы. У I групу (малодшых дзяцей) будуць хадзіць 19 дзетак (выхавацелькі Альжбета Бурачэўская і Ева Гняздоўская — улюбёная „пані” пасля Ірэны Максімюк) у старэйшых („старшакі” і „нулёўка”) пакуль толькі адна — Альжбета Рудчук.

У гэты раз у першыя дні, як ні дзіва (гэтак часта бывае ў кожным прадшколлі!) **ніхто не плакаў!** Дзеткі хваліліся, хто дзе быў летам (калі нават дома сядзеў, нудна нікому не было). А некаторыя былі і ў Венгрыі, і ў Грэцыі, і ў Бельску, і на Мазурах, і ў вёсках такіх як Лясная, Баравыя і іншыя. Расказвалі нам таксама, дзе працуюць тата з мамай, а нават і дзедка з бабкай. Працуюць у паліцыі, у рэдакцыях, у ЗУСе, робяць тканіны, ёсць шафёры, мяснікі, настаўнікі, вучоныя, проста мамы, якія вельмі шмат дома працуюць. Усе — беларусы, якім дарагія родныя мова, традыцыя і культура.

Міра Лукша
Фота аўтара

Аўто з планеты Макін

(I частка)

Самаходы на планеце Макін не адразу дарослыя, вялікія. Праўда, нараджаюцца яны ў фабрыцы, але ёсць у іх не толькі інжынеры ды рабочыя, якія займаюцца імі ў час узнікання, але і бацькі, і дзяды. Проста, у пашпарце кожнага напісана, хто такое аўто па бацьку ды маці, адкуль родам. Пасля сямейнікі займаюцца малым аўтамабілікам, пакуль не вырасце і не набудзе ўсіх ведаў, неабходных для ўсіх самаходаў на планеце. Значыць, нараджаюцца самаходы на планеце Макін малымі, і растуць. Зусім не так, як у нас, на Зямлі, дзе самаходы нараджаюцца ў фабрыках толькі вялікімі, і дзяцей яны не маюць. А дзеці, як усе дзеці на свеце — цікаўныя, ахвотныя пазнаваць новае, гарэзлівыя і час ад часу непаслухмяныя. Гэта ўсё з-за цікаўнасці, усе гэтыя выбрыкі і дурненькія задумы, якія могуць кепска кончыцца... Толькі што ў малых самаходзікаў з планеты Макін розум крыху інакшы, чым у нас, людзей, калі мы яшчэ зусім маленькія; нараджаемся быццам „незапісаная табліца”, а яны, на Макіне, маюць о-го-го якія камп’ютэрныя праграмы ўстаўлены! Маюць такія веды адразу ў найважнешай частцы арганізма, галаве быццам бы, устаўлены, якіх нам трэба вучыцца ды вучыцца, аж абрыдне. А нашы зямныя аўтамашыны дык увогуле зусім простыя ў параўнанні з імі!.. Ну, мы не будзем пра тое тут разважаць, пра тыя адрозненні ў канструкцыі. Раскажам пра маленькі самаходзік з планеты Макін, якому было вельмі цікава пабачыць Зямлю. Увогуле, жыхарам гэтае платены, Выстворам, Жывінам і Махінам, у тым і макінскім самаходам, Зямля — цікавая планета, паколькі развіццё жыцця на Зямлі нагадвае колішнія прапачаткі, ужо забытыя, жыцця на Макіне, а клімат у нас падобны. А маленькі Самаходзік, лепш назваць яго Самаездзікам, хоць усе веды, якія пра Зямлю макінская цывілізацыя ўжо спазнала, атрымаў на

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род,

Асветніца Еўфрасіння

Юная манашка

У тыя даўнія часы дзяцінства было карацейшае, чым цяпер. Калі дзяўчынцы з княжага роду спаўнялася дванаццаць гадоў, яна ўжо лічылася нявестай і пачынала рыхтавацца да вяселля. Слава аб прыгажосці і розуме Усяслававай унучкі разляцелася далёка ад Полацка, і ў горад зачасцілі сваты.

Бацькі вырашылі аддаць Прадславу замуж за сына аднаго багатага валадара. Княгіня Сафія збірала пасаг, князь Святаслаў падлічваў выгады ад шлюбу. Яны яшчэ не ведалі, што дачка выбрала іншы шлях.

Прадслава, як і некалі Рагнеда, стала манашкаю і атрымала новае імя — Еўфрасіння. У перакладзе з грэцкае мовы гэта значыць „радасць". Пазней князёўну па родным горадзе назвалі Еўфрасінняй Полацкай.

За манастырскімі сценамі яна змагла цалкам аддацца кніжнай навуцы. Еўфрасіння чытала Біблію, дзе сабрана невычэрпная чалавечая мудрасць, і іншыя старажытныя кнігі. Адна з іх, напрыклад, звалася „Шасцідзён". У ёй апавядалася, як за шэсць дзён Бог стварыў неба, зямлю, зоркі, расліны, жывых істот і чалавека. Еўфрасіння таксама вывучала летапісы, дзе гаварылася пра мінулае розных краін.

(працяг будзе)

„Лісічкі" — рапмены

28 жніўня г.г. у Ласінцы адбыўся фэст пажарнікаў. Мерапрыемства пачалося ад спаборніцтваў, у якіх прынялі ўдзел дружыны пажарнікаў з Нарвы, Тыневіч, Трасцянкі і Ласінкі. Пажарнікам заўзятарылі сябры, людзі з гэтых самых вёсак. Аднак найлепшую падтрымку мелі пажарнікі з Ласінкі, якія і сталі пераможцамі.

Прыйшоў час на выступленне калектываў. Абавязкова, як кожны год, спявалі „Лісічкі". Аднак гэтым разам было крыху інакш чым заўсёды...

Пасля дзвюх песняў мы сышлі са сцэны і хутка пабеглі пераапрануцца ў іншую вопратку. Усе надзелі доўгія і шырокія блузы з каптурамі. Паўліна Пашко, Беата Мінко і я мелі заспяваць песню „Ты казала" ў стылі рап. Мы яе прысвяцілі Эміліі, нашай старэйшай сяброўцы, якая ў гэты дзень святкавала 18-годдзе з дня нараджэння. Калі мы, „Лісічкі", выйшлі на сцэну „дзіўна апранутыя", а Паўліна пачала рапаваць першую страфу, у вачах людзей відаць было вялікае здзіўленне. Усе пачалі збірацца, каб нас пабачыць. Гэта быў новы элемент у нашай кар'еры, які, думаю, „прыняўся" і мы, мабыць, станем рапуючым калектывам...

Патрыцыя КОС
Гайнаўскі белліцэй

Рапмены ў Хмельне. Фота Ганны КАНДРАЦЮК



Ева Сегень з Беластока. Фота Ганны КАНДРАЦЮК



Міхась Альховік з Беластока. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Чакаюць узнагароды!

Увага чытачы! У рэдакцыі „Ніва" чакаюць Вас узнагароды з мінулага навучальнага года, выйграныя ў конкурсе **Польска-беларуская крыжаванка**. Узнагароды можна ўзяць у кожны працоўны дзень у гадзінах 9^{00}-15^{00}.

Ніжэй прыводзім спісак узнагароджаных:

1. **Міхал Герасімюк**, Гайнаўка.
2. **Іаанна Леанюк**, Дубічы-Царкоўныя.
3. **Марцін Мірановіч**, Беласток.
4. **Паўліна Герасімюк**, Гайнаўка.
5. **Марлена Купрыянюк**, Беласток.
6. **Уршуля Ляўчук**, Гарадок (2).
7. **Эмілія Селеванюк**, Гарадок.
8. **Паўліна Ярош**, Гарадок.
9. **Павел Пятэльскі**, Беласток (2).
10. **Марта Кучынская**, Храбалы.
11. **Малгажата Карнілюк**, Новае Беразова.
12. **Эмілія Андрасюк**, Камень.
13. **Анна Куптэль**, Бельск-Падляшскі.
14. **Марта Андрасюк**, Бельск-Падляшскі.
15. **Лукаш Свентахоўскі**, Нарва.
16. **Бася Сянкевіч**, Нарва.
17. **Наталля Астапкевіч**, Нарва.
18. **Кася Давідзюк**, Нарва.

Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце на працягу трох тыдняў у „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 34: Неба, маладзік, Лі, ранг, ластаўка. Нара, мелас, бант, лад, бліск, ікра.

маленькай магнітнай бляшцы, якую на пару хвілін падключылі да яго мозгу-камп'ютэра (калі б называць па-нашаму) лічыў, што гэта не ўсё. Ён тужліва спаглядаў з панадворка перад сваім сямейным гаражом на Зямлю, якая, бы блакітная зорачка, пульсавала над гарызонтам...

Пра што думаў Самаходзік? Пра тое, як жывуць зямныя самаходы, якіх вучоныя на Макіне лічылі найбольш актыўнымі жыхарамі нашай планеты, даследуючы іх хуткасць, спрытнасць і моц. Як бачыце, веды пра нашу планету на Макіне, мякка кажучы, толькі частковыя і нязгодныя з праўдай. Бо ўсё ж, так, як мы тут думаем, найважнейшы на Зямлі — чалавек!

Самаходзік ведаў, што не возьмуць яго на Зямлю, бо, проста, яшчэ не вырас. У школу ходзіць, а, каб быць высланым у касмічную экспедыцыю, трэба мець вялікія веды і выказацца навуковымі дасягненнямі і публікацыямі ў кнігах і часопісах. На Макіне навукай не хіба толькі Жывіны (скажу вам у таямніцы, што яны трохі падобныя да нашых людзей), а Выстворы і Махіны лічаць гэта сэнсам жыцця: як найбольш спазнаць і ўчыніць нешта ў карысць цывілізацыі. Каб усе былі здаровымі, задаволенымі, бяспечнымі, мелі цікавы занятак і жылі ў згодзе і любові адны з адным і з іншымі істотамі.

Праўда, дзеці на Макіне — паслухмяныя па сваёй натуры і ведаюць, што можна, а чаго нельга. А нельга самому без дазволу дарослых і настаўнікаў рабіць небяспечнае, а тым больш пакідаць планету. Космас — справа сур'ёзная! Але Самаходзік, падлетак ужо, не мог паўстрымацца ад цікаўнасці, і калі вялікая грамада жыхароў Макіна пайшла праводзіць касмічны экіпаж (а мільёны гледачоў маглі гэта ўбачыць з трансляцыі ў відзіне), пакруціў сваю таемную гайку, якая, у залежнасці ад патрэбы, можа цябе пабольшыць ці паменшыць, закаціўся ў люк, цераз які ўваходзілі на карабель касманаўты. Стаў такім маленькім, што ніхто яго не ўбачыў. Толькі ягоная мама, якая сачыла са свайго агародчыка за стартам карабля, адчула ў сваіх металёвых грудзях нейкі сум і трывогу.

(працяг будзе)

Міра ЛУКША

Культурныя дажынкі

У Чыжах і Бельску выступіў „Гудскі гармонік” з Ліды.

З верасня ў Бельскім амфітэатры Беларускае грамадска-культурнае таварыства разам з Бельскім домам культуры ладзілі беларускі народны фэст, названы арганізатарамі культурнымі дажынкамі. У пасляабедзенную пару бяльшчане пачулі песню „Мой Беластоцкі край”, якая афіцыйна адкрыла мерапрыемства. Сабраную публіку віталі вядучая фэст Валянціна Ласкевіч, пасол Сейма РП Ян Сычэўскі і бурмістр горада Андрэй Сцепанюк. Сваёй прысутнасцю фэст удастоілі: пасол Сейма Сяргей Плева, віцэ-консул Рэспублікі Беларусь Ігар Сякрэта і прадстаўнік Пасольства Беларусі ў Варшаве Аляксей Дзямбіцкі.

Арганізатары запрапанавалі бельскай публіцы музыку ў выкананні шматлікіх гуртоў. Першымі на сцэне паявіліся бельскія „Васілёчкі” пад кіраўніцтвам Мікалая Мяжэннага з Гродна. Потым можна было паслухаць „Дзявочых нотак”, з якімі выступалі дзве салісткі: Анна Хадакоўская і Юліта Такарэўская. Вялікую ўвагу старэйшай публікі прыцягнула выступленне гурту „Арэшкі” з Арэшкава, які спяваў без акампанементу. На сцэне выступіла таксама маладое пакаленне самадзейнікаў: дзіцячы гурт „Журавінка” і лаўрэаты школьнага конкурсу „Беларуская песня — 2000”.

У бельскім амфітэатры выступілі яшчэ гурты „Гудскі гармонік” з Ліды і „Лідэр” з Беластока. Культурныя дажынкі завяршыў гурт „The Best” з Сямятыч.

Бяльшчане мелі магчымасць купіць кніжкі і магнітафонныя касеты з беларускай музыкай. Кніжкі прапанаваў Цэнтр прэсы і кніжкі славянскіх народаў з Варшавы. Можна было атрымаць аўтографы аўтараў: Галіны Твараовіч, Анны Радзюкевіч, Яна Чыквіна і Віктара Шведа.

Беларускі народны фэст у Бельску закончыў серыю летніх мерапрыемстваў, арганізаваных БГКТ. І, як сказалі на самым пачатку пасол Ян Сычэўскі і бурмістр Андрэй Сцепанюк, на завяршальны фэст Бельск быў выбраны невыпадкова. Апошні сёлетні беларускі фэст адбыўся ў найбольш актыўным у беларускай дзейнасці горадзе Падляшскага ваяводства.

Паўліна ШАФРАН

Фота Сяргея ГРЫНЯВІЦКАГА

Свята беларускай культуры ў Чыжах

У нядзелю 3 верасня парафіяне з навакольных вёсак з самай раніцы ішлі і ехалі ў Чыжы на Свята беларускай культуры, спалучанае з дажынкавым абрадам. Прыгожая гмінная вёска набыла святочны выгляд. Людскі і аўтамашынны паток кіраваўся ў напрамку царквы, адноўленай пасля пажару старога храма. Абшырная царква хутка запоўнілася прыхаджанамі, мастацкімі калектывамі і гасцямі.

Пасля Літургіі настаяцель прыхода айцец Іаан Раманчук звярнуўся да вернікаў з пропаведдзю на прыгожай беларускай мове, звяртаючы ўвагу на цяжкую працу селяніна падчас уборкі ўраджаю, асабліва ў сёлетніх неспрыяльных кліматычных умовах. Ля дажынкавых вянкоў айцец Раманчук адслужыў малебен — падзяку Усявышняму за зямныя дары, якія пасля малебна пасвяціў.

З царквы вернікі, з дажынкавымі вянкамі, накіраваліся да Гміннага асяродка культуры. Тут да сцяны будынка прытулілася невялічкая сцэна, на якой выступілі беларускія мастацкія калектывы. Канцэрт адкрыў войт Рыгор Мацкевіч. Прывітаў ён сардэчна ўсіх прысутных, асабліва гасцей — віцэ-консула Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку Ігара Сякрэту і прадстаўніка Пасольства РБ у Варшаве Аляксея Дзямбіцага, а таксама паслоў Сейма Рэчы Паспалітай Яна Сычэўскага і Сяргея Плеву.

Ян Сычэўскі — пасол і адначасова старшыня ГП БГКТ — сардэчна падзякаваў гаспадару гміны Рыгору Мацкевічу, Гміннай управе і Асяродку культуры за аграмадную працу ў падрыхтоўцы мерапрыемства, а ўсім спонсарам — за фінансавую дапамогу. Прадстаўніца суседняй вёскі Збуч уручыла войту бохан хлеба з новага ўраджаю. „Я, як пасол, — сказаў Ян Сычэўскі, — буду намагацца, каб наш хлеб дзяліўся справядліва ў нашым беларускім асяроддзі”.

Канцэрт павяла сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч. Запрасіла яна на сцэну мастацкі калектыў „Арэшкі” з Арэшкава, які выступіў з аўтэнтычным вясковым фальклорам аб долі селяніна і яго складаным побыце. Гарачымі воплескамі ўспрынялі прысутныя мясцовы калектыў „Чыжавяне”. Спадабалася слухачам выступленне салісткі Алы Каменскай з Козлікаў, якая заспявала таксама і ў дуэце са сваім сынам Давідам Дубцом. Затым выступілі „Збучанкі” з суседняй вёскі Збуч. Падабаліся прысутным „Незабудкі” з Курашава пад кіраўніцтвам Ніны Грыгарук, асабліва напісаныя ёю на мясцовым дыялекце вясёлыя частушкі. Здабылі ўжо папулярнасць лаўрэаты школьнага конкурсу на беларускую песню Эвеліна Карчэўская і браты Юркі Астапчука: Сава і Міхась. Юрка Астапчук — лідэр гурту „Прымакі” — падабаўся слухачам як спявак і як расказчык анекдотаў аб цешчах.

Заўсёды вялікім атракцыёнам з’яўляюцца гасцінныя выступленні мастацкіх калектываў з Рэспублікі Беларусь. Гэтым разам на заканчэнне багатай праграмы выступіў Ансамбль беларускай народнай музыкі „Гудскі гармонік” з Ліды пад мастацкім кіраўніцтвам Андрэя Калышкі. Нічога дзіўнага, што гэта ансамбль народнай музыкі, а не песні, калі ў ім перавага інструменталістаў над спевакамі: дзве скрыпкі, два гармонікі, цымбалы, бубен, кантрабас, флейта. Лірычныя беларускія народныя песні ў выкананні гасцей з Беларусі слухачам надта падабаліся.

На Свяце беларускай культуры ў Чыжах прысутнічаў з абшырнай падборкай кніжак, пераважна на беларускай мове, дырэктар Цэнтра прэсы і кніжкі славянскіх народаў Ян Заброцкі з Варшавы. Анна Радзюкевіч, журналістка „Przeglądu Prawosławnego”, падпісвала кніжку „Prawosławie w Polsce”. Свае кніжкі падпісвалі таксама Ян Чыквін з жонкаю Галінай Твараовіч і Віктар Швед. Прадаваліся тут касеты з песнямі беларускіх мастацкіх калектываў Беласточчыны. Яшчэ раз выйшаў на сцэну „Гудскі гармонік” і праспяваў песню:

Запрагайце хлопцы коні, коні вараныя,
Мы паедзем даганяці годы маладыя.

Разыходзілася публіка з глыбокім перакананнем, што, на жаль, нашай маладосці ўжо нам ніколі не дагнаць.

В. Ш.

Кантакт двух светаў

На III Падляшскі пленэр інвалідаў, які ад 22 да 28 жніўня 2000 года адбываўся ў Белавежы, прыехала 35 творцаў з апекунамі. Паўсталыя мастацкія працы будуць друкавацца ў календары на 2001 год і на паштоўках.

— Пленэр — гэта нагода для кантакту двух, на першы погляд супрацьлеглых, светаў здаровых і калекіх людзей. Інтэграцыя гэтых светаў пры садзеянні мастацтва і прыроды дазваляе ім бліжэй пазнаёміцца, пераламаць стэрэатыпы аб інвалідах і дае людзям шанц стаць лепшымі, — заявіў Андрэй Валкавыцкі, старшыня Таварыства ў карысць творцаў-інвалідаў „Ніке”, якое разам з Домам сацыяльнай дапамогі з Засцянак арганізавалі пленэр.

У гатэлі Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства ў Белавежы спаткаліся калекія асобы з дамоў сацыяльнай дапамогі з Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі, Белавежы, Беластока і іншых гарадоў Польшчы. Прыехалі таксама госці з Літвы. Спачатку сустрэліся яны з белавежскім паэтам Барысам Руско, пасля ў пошуках тэмаў для сваіх мастацкіх прац наведалі Белавежскае надлясніцтва і запаведнік. У выніку паўстала многа рысункаў, акварэльных і алейных прац, графікі і скульптур. Удзельнікі пленэру малявалі лес, зброю, буслоў, пчол, рыбак. На тэатральных занятках удзельнікі пленэру рыхтавалі спектакль з лялькамі, падрыхтаванымі Адамам Вальным. Гульні з лялькамі аказаліся цікавай формай тэрапіі, якая дапамагала занятым у спектаклі акцёрам выяўляць іх адчуванні і ўяўленні.

Побач гатэля ПТТК спаткаў я некалькі скульптараў. Мікутас Гентотас з Вільні раней працаваў столярам і ў сваёй майстэрні рабіў лесвіцы. Паўтара года таму захварэў і цяпер выконвае мастацкія працы з драўніны. Тадэуш Лучай з Бельска-Падляшскага вырэзваў у драўніне ўжо з юнацтва. Чатырнаццаць гадоў таму папаў пад цягнік і страціў дзве нагі і правую руку. Пасля выпадку вырашыў вярнуцца да свайго зацікаўлення. Для разьбы выкарыстоўвае кару з таполі, якую яшчэ пятнаццаць гадоў таму зняў з ссечанага каля царквы ў Падбеллі дрэва. Вырэзвае ён звычайна твары святых, жанчын, а ў Белавежы вырэзваў выявы духаў. Свае працы паказваў у Швецыі, Данii, Францыі, пабываў на алімпіядзе ў Аўстраліі. Яго разьба трапіла таксама ў Японію і Кітай. Можна сказаць, што ён — прафесійны скульптар. А Станіслаў Пралейка з Дома грамадскай дапамогі з Харошчы выразаў караля і вельмі цешыўся сваёй другой працай у дрэве.

Арганізатар пленэру, Таварыства ў карысць творцаў-інвалідаў паўстала ў 1998 годзе, а яго стваральнікамі былі работнікі рэабілітацыйных асяродкаў для калекіх асоб. Таварыствам выдаюцца каляндар і паштоўкі з малюнкамі ўдзельнікаў ранейшых пленэраў. У час пленэру, які ў чэрвені г.г. адбыўся ў Ляўкове, інваліды ляпілі працы з гліны і выпальвалі іх у Прадпрыемстве будаўнічай керамікі.

25 жніўня г.г. у Асяродку прыродазнаўчай адукацыі Белавежскага парку адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі мастацкіх прац. Усе ўдзельнікі пленэру атрымалі там падарункі. Затым на сцэне Белавежскага дома культуры акцёры-аматары паказалі кароткія тэатральныя пастаноўкі, а ў Асяродку лясной адукацыі Надлясніцтва Белавежа „Ягелонскае” ўдзельнікі пленэру пакаштавалі печанага дзіка.

Аляксей МАРОЗ

Фота аўтара

Тадэуш Лучай з Бельска-Падляшскага.

Людское сэрца — не камень

[**1** ☞ *працяг*]

а калі дзеці ўжо прыехалі, куплялі ім вопратку і іншыя рэчы, хаця лішняга ў нікога няма. Ад брацтва вырашылі ўсім купіць адзідасы. Таксама з Бельска прывезлі новыя і ношаныя рэчы, якія сабралі дзеці адной са школ.

Але, скажу вам, не гэта было для дзяцей галоўнае. Самае істотнае было для іх **тое, што нехта з імі пагаварыў**. Паразіў, паказаў нешта новае, — Анна Фіёнік глыбока ўздыхнула.

Спадарыня Вера Ходак з дачкой Анеляй адразу вырашылі ўзяць да сябе дзяўчынку. Пані Вера падказвала сваёй шаснаццацігадовай госці, як трэба сябе паводзіць, гаварыла, каб слухалася дарослых, адным словам, павучала як магла, бо ж гэты ўзрост вельмі небяспечны. Узялі двух хлопцаў і Анна ды Багдан Фіёнікі, і Мікалай ды Валянціна Грыгарукі, і Марыя Аўрамюк, а Ірына Саковіч нават ездзіла з дзецьмі ўвесь час, аж да 18 чэрвеня. Адным словам, людзі разабралі ўсіх дзяцей, былі ў адносінах да іх вельмі сардэчныя. І дзеці гэта бачылі.

Група дзетдомаўцаў гасцявала ў Польшчы па запрашэнні Праваслаўнага Брацтва Трох Свяціцеляў два тыдні, ад дзевятага да дваццаць трэцяга чэрвеня. Дзе яны толькі не пабывалі! Арганізатары гэтай экскурсіі рабілі ўсё, што маглі, каб дзеці выехалі адсюль задаволеныя. Падрыхтавалі ім багатую праграму.

Спачатку дзецям паказалі Беласток і праваслаўныя сакральныя аб'екты. Быў малебен у царкве Усіх Святых і сустрэча з духавенствам прыхода і духоўным апекуном Брацтва Трох Свяціцеляў айцом Іавам. Пасля ў гэтым жа прыходзе адбылася сустрэча з уладыкам Іакавам. Дзеці пабывалі таксама ў жаночым манастыры ў Дайлідах. У Фастаўскім прыходзе зрабілі ім вогнішча, на якім былі таксама арганізатары і спонсары. 3 чэрвеня дзяцей завезлі на Святую Гару Грабарку. Па дарозе затрымаліся ў Бельску-Падляшскім, дзе сустрэліся з епіскапам Грыгорыем і наведалі беларускі скансэн у Дарафея Фіёніка. На Грабарцы сустрэліся з сёстрамі з жаночага манастыра святых Марты і Марыі, аглядалі Святую Гару і царкву, пераначавалі ў доме пілігрыма.

Пасля паехалі ў Белавежу, а па дарозе наведалі ў Гайнаўцы сабор Святой Тройцы і сустрэліся з дзецьмі ў гімназіі. Потым знаёміліся з Белавежскай пушчай і запаведнікам звяроў. Дзеці наведалі таксама Супрасль, дзе сустрэліся з архімандрытам Гаўрыілам і ўдзельнічалі ў малебне перад Супрасльскай іконай Божай Маці.

Напэўна, дзеці з дзіцячага дома ў Пячорах не былі б задаволены, калі б, будучы ў Польшчы, не ўбачылі Варшаву. А як жа, была і Варшава, якая дзецям вельмі спадабалася. Там 16 чэрвеня гасцявалі яны ў мітрапаліта Савы (арганізацыяй сустрэчы з пачастункам занялі ся свяшчэннікі Дарафей Савіцкі і Андрэй Баркоўскі), а пасля прымалі іх у Пасольстве Расійскай федэрацыі.

18 чэрвеня, у нядзелю, дзеці былі ў саборы св. Мікалая на канцэрце царкоўнай музыкі ў выкананні дзіцячых хораў. Пасля канцэрта ўсе яны былі запрошаны разам з выканаўцамі ў Цэнтр праваслаўнай культуры, дзе для іх былі падрыхтаваны сталы, поўныя салодкасцей. Прысутнічалі ўладыка Іакаў і тадышні консул Беларусі Павел Латушка. На наступны дзень дзеці ўдзельнічалі ў багаслужбе ў Свята-Духаўскай царкве, а вечарам выехалі ў Элк, дзе

Першая справа — Анна Фіёнік, злева — яе муж Багдан.

затрымаліся ў доме адпачынку спадара Андрэя Шыркаўца, які запрапанаваў там дзецям кароткі адпачынак. Тры ратаўнікі зорка сачылі за тым, каб ніхто не ўтапіўся ў возеры. Праехаліся брычкай па Элку, а вечарам было вогнішча. Пасля паехалі ў Аўгустаў, дзе выбраліся ў рэйс на караблі.

Арганізатары вазілі дзяцей у басейны і ў Беластоку: ў гатэлі „Галэмбеўскі", па вуліцы Мазавецкай і Стромай. Было ж гарачае лета, і трэба было даць дзецям крыху ахалоды.

Усюды знаходзіліся добрыя людзі, спагадлівыя спонсары, якія дапамагалі, не разлічваючы ні на якую кампенсацыю. Былі абеды ва „Ухвытах", якія рыхтавала спадарыня Аліцыя Саўчук, фірма „Смакош" Дарыуша Грыгорчыка карміла дзяцей у сталоўцы універсітэта — усё гэта за сімвалічную плату. А перш за ўсё даглядалі дзяцей тыя людзі, якія прынялі іх у сваю хату.

Нават у парку, на беластоцкіх плянтах, дзе ёсць будка з марожаным, уладальніца, калі даведалася, што гэтыя дзеці з дзіцячага дома, не хацела ніякай платы за марожанае і сказала, каб прыходзілі, калі толькі захочуць і елі колькі ўлезе.

Людское сэрца — не камень.

Ада Чачуга
Фота аўтара

Інтэрв'ю

Трынаццацігадовы **Коля Ольхін**, дзетдомавец з Пячораў, сам зачапіў мяне, калі мы выходзілі з Мікалаеўскага сабора, дзе адбываўся канцэрт царкоўнай музыкі ў выкананні дзіцячых хораў:

— Вы хотите взять интерв'ю?

— А ты хочаш мне яго даць?

— Хачу!

Відаць было, што на працягу таго тыдня, які дзяліў нас ад прыезду дзяцей у Беласток, Коля ўжо прывык да таго, што дзяцей мучаць журналісты.

— Ну, дык хадзем! Раскажаш, як там у вас, у дзіцячым доме.

— А я ўжо там пяць гадоў.

— І як?

— Плоховато в детском доме. Плохие воспитатели, кормят плохо!

Колю і пачастунак у Цэнтры праваслаўнай культуры не ў галаве. Нешта хутка схапіў у рот. Прыбег даваць інтэрв'ю. І іншыя дзеці хочуць, абступілі мяне.

Ведаю, што кранаю далікатную матэрыю. Але аж карціць запытацца, чаму дзеткі апынуліся ў чужым доме.

Коля, найбольш жывы хлапчук і баявіты:

— Бацькі разам не жывуць. На лета мяне забіраюць цёця і бабуля. Дзядуля браў часцей, але цяпер ён хварэе.

Алегу Шыпулінскаму ехаць няма да каго. Ён застаўся ў жыцці зусім адзін, бо яго бацькі памерлі. Такіх, як Алег, у дзіцячым доме мала.

— І нікога-нікога ў цябе няма?

— Недзе ў Карэліі ёсць дзядзя і бабуля. Я іх амаль не ведаю.

— Пра што ты марыш, Алег?

— Моя мечта: чтобы в будущем было хорошо.

Бацькі **Віктара Петухова** пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Віця гаворыць пра гэта мне проста ў вочы, як дзіця, але стараецца, як можа, сваіх бацькоў выбеліць:

— Калі вырасту, хачу паступіць у Суворaўскае вучылішча у Пецярбургу. У мяне ж бацька — вайсковец. Бацька

Злева: Коля Ольхін, Віця Петухоў і Алег Шыпулінскі.

мяне бярэ да сябе! Часамі... Калі яны развяліся, я быў з мамай. Яна мяне пакінула ў бальніцы...

Тут Віктар прыцішае голас, пачынае блытаць факты. Відаць, быў ён тады зусім маленькі, і нехта яму мо нешта расказваў...

— Бацька даведаўся, прыехаў і ўзяў мяне. Са мной была сястра. Ездзім на выхадныя...

Алег:

— У Польшчы — рай у параўнанні з дзіцячым домам. Туда еду, как в гроб. Тут прынялі нас цудоўна. Асабліва ўдзячны я бабе Лёні, дзядзю Колю і яго сыну Юрыку. Мы ў іх былі з Віцем Петуховым. Ага, і цёці Ані Фіёнік, і яе мужу Багдану, якія гэту паездку арганізавалі, мы ўдзячныя.

Коля:

— Я вельмі рады, што мяне ўзялі сюды. Мы плавалі ў басейне, наведалі Варшаву, Грабарку, сустракаліся з мітрапалітам Савам і уладыкам Іакавам.

Алег:

— Як у царкве мы младзенца Гаўрыіла пацалавалі, адразу лягчэй стала.

Віктар:

— Усе павінны верыць у Бога.

І сапраўды, вера патрэбна гэтым дзецям як нікому.

Пятнаццацігадовая **Оля Кузьміна** ў інтэрнаце школы пры дзіцячым доме ўжо другі год.

— Добра там?

— Там хорошо, но дома было бы лучше. На канікулы мяне бярэ цёця. Маці памерла. Яе забілі. Хто? Нейкі мужчына, што выйшаў з турмы. Бацька сядзіць. Я ўжо закончыла дзевяты клас і паступаю вучыцца ў Пскоў. Хачу стаць парыхмахерам.

Я не думала, што ў Польшчы столькі праваслаўных цэркваў. Мне здавалася, што тут усе каталіцкай веры.

Ліда Элекіна, шаснаццацігодка, якая жыла ў спадарыні Веры Ходак, паходзіць з мнагадзетнай, малазабяспечанай сям'і. Таму і апынулася ў інтэрнаце, дзе прабыла шэсць гадоў. Вучылася ад раніцы да вечара. Затое паступае ў Пскоўскі педагагічны інстытут. Хоча быць біёлагам ці географам.

— А пра што марыш ты, Коля?

Коля на нейкі момант прызадумваецца, мяркуе.

— Побыстрее из детдома выйти!

Відаць, што дзецям абрыдла гэткае жыццё, і крыўдна ім, што менавіта ім такія бадзянні наканаваў лёс. У Беластоку яны шчаслівыя, бо тут адчулі хоць крышачку сямейнага цяпла, наеліся ўдосталь не толькі кашы, але і бульбачкі. Тут добра, сцвярджаюць дзеці ў адзін голас.

Усюды яно, дзеткі, добра, калі ў цябе ёсць родны дом і клапатлівыя бацькі. Ніякі, нават найлепшы дзіцячы дом не заменіць матчынага сэрца і ласкі — гэтай надзейнай падпоры ў жыцці. Ці ў Расіі, ці ў Польшчы. Але і так веру, што, нягледзячы на нягоды сірочага лёсу гэтых дзяцей, вырастуць з іх добрыя і вартасныя людзі.

Ада Чачуга
Фота аўтара

Трагедыя Скірмунтаў

... кроў Яго на нас і на дзецях нашых (Мф. 27, 25).

Дабро і зло — дзве непазбежныя крайнасці існавання чалавецтва. Хаця часцей мы шукаем крыніцы дабрасардэчнасці, узыходжання да подзвігу і абыходзім маўчаннем самыя подлыя людскія заганы, даючы ім толькі адназначную ацэнку — зло. І, зрабіўшы гэта, працягваем яму не супраціўляцца.

Праходзяць гады...

Каму на Піншчыне невядома вёска Парэчча? Што вы запомнілі, пабываўшы там? Хутчэй за ўсё, даўні асірацелы парк, які захоўвае яшчэ ледзь прыкметныя рысы былой велічнасці. У яго глыбі, ля самага берага Ясельды, віднее з чырвонай цэглы прамысловы будынак незвычайнай архітэктуры. Хто больш гаварлівы, той абавязкова пацікавіцца ў вяскоўцаў: „Чыё ўсё гэта?" — „Скірмунтаў, Рамана", — з гонарам адкажуць яны. Але на просьбу расказаць аб гэтым чалавеку парачане апусцяць вочы, замітусяцца, быццам бы кудысьці спяшаліся. Альбо ціха скажуць: „Забілі. Свае ж з вёскі, як саветы прыйшлі".

Нават скрупулёзна перачытваючы беларускія выданні апошніх дзесяцігоддзяў прозвішча Скірмунт сустрэць амаль не ўдаецца. І гэта не толькі таму, што „праслаўляць" памешчыкаў не ўваходзіла ў рамкі савецкай гісторыі. Згаданы Раман Скірмунт меў прамыя адносіны да абвяшчэння 25 сакавіка 1918 года Беларускай Народнай Рэспублікі, аб існаванні якой зусім гаварыць было забаронена. Ён быў адным з кіраўнікоў Беларускага нацыянальнага камітэта, затым лідэрам Мінскага беларускага прадстаўніцтва. Па гэтай прычыне вясной 1918 года працаваў у складзе Рады БНР, узначальваў Народны сакратарыят.

Скірмунты заўсёды знаходзіліся ў апазіцыі палітыцы Расіі, накіраванай на русіфікацыю зямель былога Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. У іх маладоўскім, затым парэцкім маёнтках камплектаваліся багатыя бібліятэкі, у якіх знаходзіліся рэдкія кнігі на тэму гісторыі і фальклору. Гасцямі і сябрамі Скірмунтаў былі дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху. Сярод іх былі: Напалеон Орда — музыкант, мастак, у маладосці ўдзельнік паўстання 1831 года, пісьменніца Эліза Ажэшка — удзельніца паўстанцкага атрада Рамуальда Траўгута ў 1863 годзе. Адным з прыхільнікаў ідэі нацыянальнага адраджэння стаў Раман Скірмунт, член І-й Дзяржаўнай Думы, з лістапада 1910 года — член Дзяржаўнага савета Расіі. „Аднак, — адзначае даследчык Алесь Смалянчук, — на яго дзейнасць заўсёды клала адбітак моцнае пачуццё краёвага патрыятызму. Р. Скірмунт заўсёды быў перакананы, што вызначыць лёс краю павінны тыя прадстаўнікі вярхоў мясцовага грамадства, якія помнілі пра сваё беларуска-літоўскае паходжанне і глядзелі на Беларусь і Літву як на Айчыну. Р. Скірмунт пачынаў як палітычны дзеяч краёвай плыні польскага руху, але ў яго самасвядомасці заўсёды прысутнічала пачуццё кроўнай блізкасці з беларускім народам. У 1917-1921 гады яно канчаткова пераўтварылася ў нацыянальнае пачуццё". Вось што пісаў Скірмунт: „Я сам ураджэнец Палесся, патомак літоўскай сям'і з даўніх часоў, якая навекі асела ў гэтым краі, і мае продкі да XVII стагоддзя карысталіся беларускай мовай у якасці хатняй. Я заўсёды быў і буду горача адданы свайму народу — яго месцазнаходжанню не за Нёманам і Бугам, і не на Волзе, а тут, у Беларусі". Параўнаем гэтыя словы са сказаным у 1918 годзе старшынёю Мінскага камітэта рабоча-сялянскай партыі бальшавікоў В. Кнорыным: „Мы лічым, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй і што этнаграфічныя асаблівасці, якія аддзяляюць іх ад астатніх рускіх, павінны быць выкаранены".

Менавіта гэтым прынцыпам і кіравалася новая, прынесеная на штыках улада.

Пасля Рыжскага дагавора 1921 года паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, у адпаведнасці з якім Заходняя Беларусь адышла да апошняй, і, па сутнасці, ліквідацыі БНР, Р. Скірмунт вярнуўся на Піншчыну, у Парэчча. Удзельнічаў у грамадскім і гаспадарчым жыцці краю, выбіраўся сенатарам Рэчы Паспалітай. „Далейшы лёс невядомы" — значыцца ў кароткай біяграфічнай даведцы, прыкладзенай да адной публікацыі аб дзейнасці БНР. Сёння мы можам сказаць: далейшы лёс Рамана Скірмунта вядомы і ён, як меркавалася, быў трагічны.

Наступаў 1939 год. Р. Скірмунту было ўжо за 70 гадоў. Разам з ім у Парэчы жывуць яго сястра Галена з мужам Баляславам Скірмунтам. Цяжка паверыць, што не здагадваліся яны, якія „вызваліцелі" прыйдуць з усходу на іх зямлю. Але Раман ведаў — нічога дрэннага ён людзям не зрабіў. Памагаў бедным, ахвяраваў пагарэльцам, даваў зерне ў час неўраджаю, фінансаваў школы. Да гэтай пары, нават цераз некалькі пакаленняў, успамінаюць парачане Скірмунта, які калісьці зрабіў дабро іх бацькам і дзядам. Але чым адплацілі яны чалавеку, які спадзяваўся на ўзаемнасць?

Свабода, першапачаткова пазбаўленая маральных асноў і сродкам да якой становіцца толькі гвалт, пераараджаецца ва ўсёдазволенасць. Як цяжка выхаваць чалавека і як лёгка абярнуць яго ў нікчэмніка, устанавіўшы, што ў імя ідэі можна зрабіць усё. Забівалі не самі Сталін ці Яжоў — тварылі беззаконне даведзеныя да вар'яцтва людзі, бачыўшыя ў зле дабрадзейнасць.

Нядобрай стала для парачан тая далёкая цяпер восень 1939 года. Жаль, мала дажыло да нашых дзён сведкаў гэтага часу. Мабыць, не захаваліся і архіўныя дакументы. Ды і наўрад ці было запісана аб тым, што гавораць у сваіх успамінах пасля больш пяцідзесяці гадоў людзі. А гэта жыхары Парэчча Хрысціна Тарлецкая, Арсенцій Ярмаковіч і Антаніна Каласоўская, якая з 1941 года мае пінскую прапіску. Папробуем з іх слоў устанавіць тыя няблізкія, няпростыя, але аб'яднаныя чалавечай памяццю здарэнні.

Хрысціна Тарлецкая: Мала хто тады ведаў у Парэччы, хто такія бальшавікі, чулі толькі. Скора, як вайна пачалася, пабачылі: едзе па вузкакалейцы каля вёскі паравоз з чырвоным палотнішчам. „Бальшавікі" — рашылі нашы хлопцы, сустракаць пабеглі, а па іх з вагонаў кулямётная чарга. Аказалася — польскія жаўнеры. Хацелі яны Парэчча спаліць за тое, што іх за чырвоных прынялі. Стары Скірмунт афіцэра пайшоў прасіць: зняў ікону, на калені стаў за людзей.

Антаніна Каласоўская: Іду з гумна, гляджу: армія невядомая ідзе, коннікі, за імі танкі. Па размове чую — рускія... Паліцэйскія, якія ў вёсцы былі, за раку ўцяклі. А адзін з іх, Ігнат Біда, зусім малады, ноччу рашыў вярнуцца. Дзяжурыўшыя на пароме хлопцы яго злавілі і забілі.

Арсенцій Ярмаковіч: Восенню, пад самую зіму, прыйшлі ў маёнтак за Скірмунтам. Пані Галена ў горадзе хавалася, а Рамана і яе брата павялі ў былую гміну.

Хрысціна Тарлецкая: Калі іх вывелі, не знайшлося людзей, каб заступіцца. Толькі Андрэй Кулеш выйшаў і гаворыць: „Навошта вы гэта робіце?" А перад тым Рыгор Чугай, як пачуў, што Скірмунтаў хочуць забіць, узяў каня, моў, захварэў, і павёў яго да ветэрынара ў маёнтак, папярэдзіўшы аб рухтуючымся злачынстве. Даведаўшыся аб небяспецы, Скірмунт папытаў у лекара: „Хто прыходзіў?" — і сказаў: „Калі сам Чугай не зробіць гэтага, то ніхто мяне не кране".

Арсенцій Ярмаковіч: З гміны іх ужо на смерць адправілі. Забівалі нашыя, парэцкія — Сільвестр Лукашык, Усцін Пархамчук і Іван Цудзіла. Уладзе новай хацелі выслужыцца, дапамагчы. Вывелі Скірмунтаў у бок вёскі Охава і ўмярцвілі.

Хрысціна Тарлецкая: Аднойчы я была сведкай, як Сільвестр Лукашык падвыпіў і гаварыў: „Завялі мы іх і заставілі яму капаць. Раман адмовіўся: «Не заслужыў сабе магілу капаць». Баляслаў малодшы быў, адразу спужаўся, зусім панік. Заўважыў гэта Скірмунт, абапёрся на сук — цяжка стаяць, ішлі доўга — і просіць: «Хутчэй рабіце што рашылі». «Павярніся», — прыказваю яму. А ён глядзіць на мяне, адпавядае: «Я нічога дрэннага нікому не рабіў». Я ўдарыў яго, але той працягвае: «Не думайце, што прашуся, я сваё пражыў, не бярыце грэх на душу». Цудзіла кінуў вінтоўку, Пархамчук таксама ўцёк. Прыйшлося мне канчаць".

Пані Галена тады ў Пінску хавалася, мела прыстанішча ў прыватным доме каля вакзала. Яшчэ пры саветах даведалася аб смерці мужа і брата, а калі прыйшлі немцы, папрасіла сваіх, хто ў маёнтку працаваў, каб Скірмунтаў выкапалі, і ў парку пры сядзібе перазахавала.

Арсенцій Ярмаковіч: Нядоўга пасля гэтага пані Галена пажыла. Прыйшлі партызаны і яе забілі.

Хрысціна Тарлецкая: Партызан прывёў Пятро Мельнік. Ён у маёнтку падзарабляў, сказаў, што пані з немцамі ў сялян усё забіраюць. А гэта была няпраўда. Партызаны забралі Галену і двух немцаў, якія аказаліся побач дома. Калі яе знайшлі ў лесе, ледзь распазналі, так яе знявечылі. Пахавалі ў парку побач мужа і брата.

Некалі над магіламі стаялі крыжы. Самі парачане А. Бутыч, П. Цярэшка, В. Каваль зрабілі іх. Гэтыя ж людзі пахавалі Галену Скірмунт. Крыжы згнілі, пахіліліся, затым і зусім упалі, ператварыўшыся з гадамі ў парахню, як сталі прахам і змяшаліся з зямлёю целы ляжачых пад імі людзей.

Што сталася з тымі, хто пазбавіў іх жыцця?

С. Лукашык доўгі час стараніўся ад людзей, працаваў у калгасе, сталяраваў.

— Сам Сільвестр доўга не прызнаваўся. А так, калі не спытай, заўсёды аднекваўся: „Не я", — успамінае Е. Глушко.

І. Цудзілу яшчэ да 1941 года асудзілі за хуліганства. У Парэчча ён так і не вярнуўся. Хадзілі па вёсцы чуткі, што ён прабаваў уцякаць з канвоя, але быў застрэлены.

Цяжка сказаць, як склаўся лёс У. Пархамчука. Гавораць, што ён хаваўся дома, а калі памёр, „жонка ў бульбяной яме закапала". У апублікаваных спісках жыхароў Парэцкага сельсавета — салдат і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Пархамучук Усцін Андрэевіч, 1904 года нараджэння значыцца як прапаўшы без весці.

Трагедыя парэцкіх Скірмунтаў не адзіная. Той жа восенню, у верасні, у Малодаве загінулі Марыя і Генрык — дваюрадныя Рамана і Галены Скірмунтаў. Не высветлена, што сталася з арыштаваным Станіславам з Бакініч. Начныя пагромы, падпалы прыйшлося перажыць Скірмунтам з нарачанскага мястэчка Шаметава.

У жніўні 1992 года намаганнямі энтузіястаў на магілах у парэцкім парку быў устаноўлены і пасвячаны крыж. Калі раней сяляне спяшылі хутка абмінуць гэтае месца, то цяпер прыносяць на магілы букеты Памяці.

Вячаслаў ІЛЬЯНКОЎ, г. Пінск

Усё было спалена

Успаміны Рыгора ТАРАСЮКА, жыхара вёскі Круглае ў Арлянскай гміне, народжанага ў 1916 г. у Самары.

У 1914 годзе казакі выганялі маіх бацькоў у бежанства і яны апынуліся ў Самары, дзе нарадзіўся я. Пасля бацька знайшоў работу ў Нованікалаеўску (пазней Новасібірску) і наша сям'я пераехала туды. Там бацька сторажам у складзе быў.

Настаў голад. Людзі людзей елі. Мая сястра апранулася і выйшла ў горад. Там *ізвозчыкі* сталі яе клікаць падвезці. Побач была крама і прадаўшчыца стала сястру настойліва клікаць да сябе. Сястра зайшла ў краму, а прадаўшчыца кажа:

— Добра, што ты не паехала, а то яны вывезлі б цябе за горад, вопратку тваю забралі б, а цябе зарэзалі б на мяса.

Страх было выходзіць, толькі дома трэба было сядзець. Хлеба не было, але мы неяк жылі. Кожны тыдзень бацька прыносіў па дзесяць яек, якія давалі на душу аднаго бежанца. Нас было пяцёра: тата, мама, дзве сястры і я, і тата прыносіў па пяцьдзесят яек.

Ад голаду і бандаў бацькі рашылі ўцякаць на радзіму, дзе ў іх было восем гектараў поля. Бацька пасылаў па дакументы, што мы ў Круглым пры цары жылі, а там войт пытаў у вёсцы, ці гэта так, а яму сусед адказваў, што такіх не было; ён хацеў сабе забраць тую бацькаву зямлю. Аднак аднойчы другі сусед сказаў войту, што наша сям'я тут жыла і мы атрымалі дазвол вяртацца.

Ехалі поездам і, коратка, параходам; я баяўся на параход уваходзіць. З Брэста прыехалі ў Рыгораўцы; з намі вярталіся яшчэ людзі, якія далей за Бельскам жылі.

Вярнуліся на Пакрову 1923 года. Нічога нашага не было, усё было спалена. Той гаспадар, што хацеў наша поле забраць, прыняў нас да сябе, у *шпіхерык*, і там мы перазімавалі. Людзі нам есці давалі — прыносілі хлеб, бульбу. Пасля тыя, што засявалі наша поле, бралі сабе два, а нам трэці сноп давалі. Пасля тата пазыку ўзяў, польскія ўлады далі запамогу і бацька паставіў хату. Клуні не было, бацька загарадку ў садзе балясамі абгарадзіў і там малаціў. Пасля дашок зрабіў і там каня трымалі. Пазней бацька хлеў паставіў. Сёстры цялятка зарабілі, то і карову выгадавалі. Пасля бацька парася купіў.

Я ў школу ў Круглае хадзіў, якая размяшчалася ў панскім доме, дзе было мо з дваццаць пакояў; пасля той дом адзін гаспадар купіў і разабраў. Нядоўга хадзіў я ў школу, чатыры гады, бо трэба было зарабляць на пражыццё. Пайшоў пасвіць у Москаўцы, Вульку-Выганоўскую; пяць гадоў пасвіў. А сёстры служылі аж за Боцькамі. Сёстрам адзежаю і грашыма або збожжам плацілі. Адзін добры гаспадар даў бацьку *клёц* зрэзаць. А мне збожжам плацілі.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Арлянскія пажарнікі — самыя дынамічныя

З году ў год расце колькасць пажараў і небяспечных здарэнняў на дарогах у Бельскім павеце. Каб спыніць гэтую адмоўную тэндэнцыю, пажарнікам трэба практыкавацца.

Як паведаміў павятовы камендант Пажарнай аховы Ян Барташук, ад студзеня да 20 жніўня гэтага года на тэрыторыі павета здарылася 265 небяспечных выпадкаў, у тым ліку 155 пажараў і 110 здарэнняў на дарогах. За ўвесь мінулы год зафіксаваных было 298 выпадкаў, у тым ліку 184 пажары. Рост колькасці пажараў выкліканы быў сёлета атмасфернымі ўмовамі вясной і летам, а павелічэнне колькасці небяспечных здарэнняў на дарогах з'яўляецца вынікам росту колькасці машын на дарогах, іх тэхнічнага стану і стану дарог.

Пажарнікі, не толькі прафесіяналы, але і дабравольцы, часта вядуць нетыповыя для пажарнай справы акцыі, напрыклад, прыбіраюць з дарог паваленыя ў час віхуры дрэвы. Гэтым 20 жніўня займаліся ў Арлянскай гміне пажарнікі, якраз напярэдадні спартыўна-пажарных спаборніцтваў.

Мэта спаборніцтваў — мабілізацыя пажарнікаў-дабравольцаў да інтэнсіўнага абучэння, набывання спецыялістычных навыкаў, неабходных у барацьбе з агнём, а таксама папулярызацыя пажарнай тэматыкі сярод грамадства. Мясцовыя пажарнікі такім чынам практыкаваліся перад павятовымі спаборніцтвамі, якія адбываюцца кожны другі год.

Арлянскія спаборніцтвы праходзілі ў старым дворскім парку XVIII стагоддзя, у якім былі бачны вынікі начнога ўрагану (паваленыя на зямлю старыя дрэвы і паламанае галлё). Майстэрства арлянскіх пажарнікаў прыйшла пабачыць шматлікая публіка. Пажарнікі ўстанавілі ў парку гукаўзмацняльнікі, пускалі музыку, а ў ваеннай палатцы размясціўся кіёск з ахаладжальнымі напоямі і півам.

З сямі каманд, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Арлянскай гміны, у спаборніцтвах прынялі ўдзел чатыры. Пятая каманда з 15 дабравольцаў з Маліннік на спаборніцтвы прыехала, але не змагалася, бо не даехаў шафёр з пажарнай тэхнікай. У ходзе мерапрыемства пажарнікі спаборнічалі ў двух відах пажарна-прыкладнога спорту: пажарная эстафета з перашкодамі (7 х 50 м) і баявое разгортванне шлангаў. Першае месца з агульным часам 109,8 секунды заняла пажарная каманда з Орлі. На чарговых месцах апынуліся каманды з Рыгораўцаў (117,4 сек.), Градалёў (118,5 сек.) і Рудутаў (156 сек.).

Пераможцы з Орлі атрымалі рэчавыя ўзнагароды ад гмінных улад.

— Арлянская пажарная каманда ў чарговы раз даказала, што яна — самая дынамічная ў гміне, — сказаў павятовы камендант. — Стан баявой падрыхтоўкі ў іх высокі і таму ўваходзіць яна ў сістэму краёвай выратавальна-тушыльнай службы і здольная весці акцыі на тэрыторыі ўсяго павета.

Спаборніцтвы закончыліся ўручэннем заслужаным пажарнікам медалёў, а дабравольцам з трох пераможных каманд — дыпломаў і рэчавых узнагарод ад Гміннай управы. Пасля спаборніцтваў войт запрасіў пажарнікаў і публіку на гарачы бігас, а на пляцоўцы пад паваленым бурай каштанам да вечара іграў музычны калектыў з Градалёў. Аднак весяліцца доўга не прыйшлося, бо наплылі цёмныя хмары і пачаў ісці дождж, які і закончыў мерапрыемства.

Міхал Мінцэвіч
Фота аўтара

Да баявых практыкаванняў рыхтуюцца пажарнікі з Градалёў.

ВЕР — НЕ ВЕР

Астроне! Сніцца мне, што я ў роднай вёсцы, у нашай маленькай хатцы. Глянуў я ў акно, а там — рука злодзея, які імкнецца адчыніць акно, каб пасля ўлезці праз яго ў хату.

Страх агарнуў мяне. Што рабіць? І раптам я расшпіліў порткі і... сікаю на злодзея.

А пасля бачу: мая баба стаіць на панадворку і гамоніць з гэтым чалавекам. Во, думаю, гадаўка...

Скажы, Астроне, што мяне чакае!

Яраслаў

Мне, Астроне, прыснілася, быццам я лапатай капаю агарод. Раблю гэта салідна, капаю глыбока, на поўную лапату. Прыціскаю яе нагой, адвальваю вялікія скібы.

Раптам бачу, што я выкапала нейкія саджанцы. А тут во кветачка. Я бяру яе і перасаджваю ў другое месца.

У зямлі былі нейкія клубні, цыбулькі (здаецца, цюльпанаў). Быў дзірван, а мне хацелася, каб там раслі кветкі. Як табе здаецца, Астронку, што гэты сон прадвяшчае?

Міра

Яраслаў! Злодзея сніць — небяспека, страта, варожасць. Нехта прабуе табе рабіць, як кажуць, каля пер'яў. Але, бачу, ты знайшоў цалкам арыгінальны спосаб, каб гэтага злодзея пагнаць. Проста, насікаў на яго. Цікавая зброя! Але злодзей гэты, бач, з бабаю тваёй шушукаецца. Відаць, хоча падлажыць табе свінню з боку бабы. Сцеражыся!

Міра, а ты — рамантычная душа. З дзірвана хацела б зрабіць градку з кветкамі. Капала ты салідна лапатай, а гэта лапата (бачыць яе, купляць, ці капаць ёю), абазначае нейкую страту, няшчасце. Ты цяжка працавала, адвальваючы вялікія глыбы. Але ж вось убачыла ты кветачку. Яна кволая, але ты яе перасаджваеш у другое месца, каб яна прыжылася. Кветкі абазначаюць радасць. Можа, твая салідная праца ўсё-такі выраўняе твае страты і прынясе табе задавальненне.

Астрон

Не ўсё мераецца адной меркай

Адгалоскі

Я не ведаў, што Мікалай Лук'янюк такі малавер. У сваім допісе „Дзе бяда?", які друкавала „Ніва" ў 35 нумары ад 27 жніўня піша так: „Калі нашы сродкі масавай інфармацыі гавораць пра бяду за ўсходняй мяжой, аксьці мне ў гэта не хочацца верыць". І далей так разважае: „На маю думку, у нас людзі жывуць горш, асабліва сяляне па вёсках, рабочыя па гарадах і пенсіянеры". Мне здаецца, што сябра Лук'янюк бачыць толькі кончык свайго носа і жыццё ацэньвае аднабакова на прыкладзе тых, якія „заўсёды прыязджаюць акуратна апрануты і на добрых машынах". „Людзі з-за ўсходняй мяжы" — гэта не толькі гандляры, якія прыязджаюць у Польшчу, але сяляне ў калгасах ды рабочыя на прадпрыемствах. Ці аўтар допісу хоць раз пагаварыў з імі і запытаў пра іхнія зарплаты і ўмовы жыцця?

Неаднойчы ў час сваіх падарожжаў у Брэст я цікавіўся гэтымі справамі і магу станоўча заверыць, што сапраўды нялёгка ім жывецца. Тое, што мне вядома, не кожнаму знаходзяцца грошы, каб адкрыць візу. Але візы ў Польшчы не прадасі. Патрэбны і тавар, „хадавы" тавар, які можна прадаць з прыбыткам. І зноў патрэбны грошы. Без іх ані руш. Калі еду на цягніку ў Брэст, дык сустракаю тых самых людзей. На чаромхаўскім рыначку бачу тых жа чаўночнікаў, якія сістэматычна карыстаюцца пагранічным пераходам Полаўцы — Пяшчатка. Ім напэўна крыху лепш жывецца, бо за прададзены буталь гарэлкі ці блок папяросаў капне нейкая доля, і купіць чалавек кусочак каўбаскі. Але Лук'янюку пэўна невядома, колькі „турысту" з-за ўсходняй мяжы каштуе гэты прыбытак. Тады скажу: гадзіны патрачанага часу і нерваў. Бо не заўсёды такі тавар прадаецца (многа прадаўцоў, мала кліентаў) ды і на сторажаў парадку трэба азірацца, каб тыя не канфіскавалі тавар і не аштрафавалі. А наконт цаны тавараў скажу такое: тое, што для нас з'яўляецца танным, для звычайнага селяніна ці рабочага ў Беларусі з'яўляецца дарагім. Бо іхнія зарплаты непараўнальна меншыя за нашы. І пра гэта трэба памятаць.

Уладзімір Сідарук

Нішчаць дарожныя знакі

Нядаўна ехаў я аўтобусам з Нараўкі ў Бандары і ўбачыў пагнуты і сарваны дарожны знак „Стоп" на чыгуначным пераездзе каля Гарадзіска. Пакамечаныя знакі стаяць перад чыгуначным пераездам каля бензастанцыі ў Новым Ляўкове. А крылы дарожнага знака-крыжа тут жа скручаны ў вузел.

Як бы мала гэтага, табліца з надпісам: „Нараўка" скрыўленая. Гэтак жа зрабілі вандалы з дарожным указальнікам з надпісам: „Лешукі 4" на скрыжаванні дарог у Лешукі, Бандары і ў Новае Ляўкова. **(яц)**

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 85) 743 50 22.
Internet: http://www.kurier-poranny.com/niwa
E-mail: niwa@kurier-poranny.com

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Dziedzictwa Narodowego.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2000 r. upływa 5 września 2000 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2000 r. wynosi 19,50 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 84,00; pocztą lotniczą Europa — 96,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 120,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Towarowa 28, 00-958 Warszawa. Nr konta PBK S.A. XIII Oddział Warszawa 11101053-16551-2700-1-67.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 2,70 zł, a kwartalnie — 37,80 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 3,60 (kwartalnie — 50,40), pocztą lotniczą: Europa — 4,20 (58,80), Ameryka Płn., Afryka — 4,90 (68,60), Ameryka Płd., Środk., Azja — 5,60 (78,40), Australia — 6,30 (88,20). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-207917-2700-1-65.

Ніўка

„Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

Сустракаюцца дзве сяброўкі:

— Учора я вырвала балючы зуб.

— І што: баліць яшчэ?

— Не ведаю, я пакінула яго ў дантыста.

* * *

У лекара:

— Чым праяўляецца ваша амнезія?

— Папросту забываю, што ў мяне жонка.

* * *

Маладая дзяўчына выйшла замуж за старога прафесара. У пасляшлюбную ноч ён гаворыць:

— Штосьці мне не выходзіць, мая дарагая. Мусіш папрацаваць крыху ручкамі.

Жонка ўзялася за работу. Старалася аж спацела, але безвынікова:

— Не магу даўжэй, — кажа мужу, — рукі мне ўжо забалелі.

— Калі маецца хворыя рукі, то не выходзіцца за прафесара!

* * *

Пасля абследавання Колі ўрач гаворыць:

— Прычынай вашага няшчасця з’яўляецца гарэлка.

— Сапраўды?! А жонка мне ўвесь час паўтарала, што гэта мая віна.

Крыжаванка



Гарызантальна: 2. цыліндрычная пасудзіна з плоскімі днішчамі і выпуклымі бакамі, 4. пярэдняя частка сцэны, 6. выдуманае фантастычнае апавяданне, 7. птушка з вялікаю дзюбай, 9. жаночае кароткае паліто, 11. інструмент для рэзання, 12. шум ад узнятай хвалі, 13. прыводзіць у выкананне смяротны прыгавор, 15. перыяд палавой актыўнасці ў млекакормячых, 17. расплаўленая маса ў глыбінях Зямлі, 18. слухачы даклада, 19. помпа.

Вертыкальна: 1. апаражненне, 2. рошчына на самагонку, 3. прыхільнік якога-небудзь вучэння, 4. камера для аднаго зняволенага, 5. навука аб пухлінах, 6. мінерал, разнавіднасць крэменязёму, 8. перамяшчанне чаго-небудзь на сабе, 9. утварэнне глухіх гукаў, якія нагадваюць працяглае вымаўленне гука „с”, 10. глухая мясцовасць, 14. музыка, што іграе на альце, 16. правы прыток Лены, 17. аўтар „Капіталу” (1818-1883). **(Ш)**

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 32 нумара

Гарызантальна: Купала, Руставі, Руанда, Цьепала, столік, стакан, Ібунджы, Колінз, крапіва, Пісара.

Вертыкальна: працэс, асвета, гамана, Кірас, Паапо, людзі, трубач, Людвіг, крыжак, Трокі, кніга, нізка.

Рашэнне: **Іван Ермачэнка**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Вользе Дземяновіч** з Варшавы і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Спосаб на гаспадыньку

Ігнат урэшце выбраўся да дачкі ў Элк. У яе — усё нармальна, пабыў пару дзён дык трэ вяртацца ў сваю вёску. Унучаняты ўсе ў школу пайшлі, падгадаваныя, дык дзед ужо не такі патрэбны ў хаце. З бабкай было б мо іначай, ды дзедаваігнатава бабка („матка, падавай на стол” — так да яе азываўся пры жыцці) адышла ў лепшую краіну. Проста пакінула свайго Ігната на ласку лёсу. Толькі цяпер мог ацаніць, што гэта за такое „я зарабляю грошы, а ты ў хаце нічога не робіш цэлымі днямі”. Вучыся цяпер, бы малы, як жыць: страву нагатаваць, прыбраць, памыць, самому апрануцца як чалавек, калі нічога не пагладжана ды не прышыты ўсе гузікі... Вось, жыві! І нудна — ні да каго азвацца нават на тое, каб накрычаць. Не, не кажу, што Ігнат быў нядобры для свае Дуні — не быў горшы чым іншыя мужыкі, але каб быў ведаў, што за скарб меў дома, дык шанаваў бы! Слухайце, мужычкове, ды кумекайце!

Ну, выехаў Ігнат з таго Элку, дабраўся ў свае бакі. Аўтобус, не такі паспешны, калываўся на калдобінах. Да Ігната падсела кабета. Стары адчуў сябе волатам — пазаўчора пабрыты, у сівым касцюме прэзентавацца не мог кепска. Абрыдла яму перапісвацца з кабетамі з газетных аб’яў. Кожная піша, што прыемная на выгляд, любіць агарод ды жывёл, без шкодных заган, акуратная, а паявіцца, дык і не пазнаеш! А пажывеш!.. Толькі на кашалёк дзівіцца: першае пытанне — пра пенсію! І пра ўзрост — каб мо жыў незадоўга, і найлепш каб унукаў не меў, спадкаемцаў. Ці то мо дагэтуль Ігнату не шанцавала? Хоча мець добрую душу пад бокам. І нябрыдкі, і небедны (хата ў два пакоі з кухняй, вада, газ...), і характар у яго, здаецца, не такі кепскі... А то прыедзе такая, дык гатова цябе адразу ў труну класці. Або, кажа, прадавай хату ў мястэчку і давай у Беласток. Мала то абрабілі бабы знаёмых — прадасі, а тая грошы ў кулак і гайда ў свет!

Жанчынка, што сядзела каля Ігната, ветліва ўсміхалася і ківала галавой на прапановы старога. Але, кажа, сёння не можа яго наведаць, бо ж дамоўлена ў іншым месцы. Мо іншым разам?..

— Наступнага разу можа і не быць. У чацвер да мяне прыязджае кабета. Мо будзе ў самы раз? Дапасуемся?

І ложак у Ігната мяккі, і канапа ёсць пругкая. Ой, дагодзім сабе! Кабета ўсміхнулася. А мо выбераце сабе з каталогу жанчыну адпаведную? Або з газеты? Ігнат расхадзіўся: а каб іх, гэтых бабаў! Зараз жа падаў прыклады на іх паганасць, і чаго то яны хочуць. А ці то грэх, што чалавек хоча хоць на старасць выгадна пажыць? Ага, і яны хочуць? Кожны ведае, чаго яны хочуць. Багацця, о, такое выгады. Голы ніякіх шанцаў не мае.

Памаўчалі крыху. Дзядуля абдумваў наступны ход.

— А вы так добра трымаецеся. І поўная энергіі жыццёвай, ахвоты да жыцця...

— Ну, не выпадае кепска трымацца ў мае трыццаць гадоў, — адказала дзяўчына і ўстала, бо Ігнат збіраўся ўжо сыходзіць з аўтобуса. Перасмыкнуўся ён пад яе ўзнёслымі грудзямі ў аняменні. А ўвесь аўтобус, што ўсю дарогу прыслухоўваўся няціхаму дыялогу пары на першым сядзенні, ад радасці аж зайшоўся.

Вандал Арлянскі

Рок-гіт-парад Радыё Рацыя

105.5 FM

У эфіры рок-гіт-парад гучыць кожную другую суботу а гадзіне 16.15 на хвалях Радыё Рацыя 105.5 FM. Усіх, хто цікавіцца беларускай рок-музыкай прыняць удзел у плебісцыце запрашае вядучы — Лукаш Сцепанюк. Свае прапановы можаце дасылаць па пошце (***Radio Racja, ul. Ciepła 1/7, 15-472 Białystok***) або па электроннай пошце (***radio.racja@poczta.wp.pl*** або ***stepb@poczta.wp.pl***). Для ўдзельнікаў узнагароды — магнітафонныя плёнкі з беларускай рок-музыкай.

Паясненні да спіска: першая лічба — месца, якое песня заняла ў актуальным выпуску рок-гіт-параду; другая лічба — месца, якое песня заняла ў папярэднім выпуску (два тыдні таму); трэцяя лічба — інфармацыя, колькі песня набрала ачкоў у плебісцыце.

17 выпуск, 09.09.2000 г.

1	1	90	Ріма, „Прывык”
2	3	82	Н.Р.М., „Паветраны шар”
3	2	78	Exist, „Памыліўся”
4	4	71	Лешчу, „Новае стагоддзе”
5	10	70	Н.Р.М., „Партызанская”
6	5	60	Крыві, „За туманам”
7	8	57	Алесюкі, „Беларусачка”
8	9	56	Зніч, „Вол бушуе”
9	12	52	Р.Ф. Брага, „Не гавары”
10	14	51	Р.Ф. Брага, „Рэчанька”
11	—	50	Уліс, „Радыё свабода”
12	7	48	Н.Р.М., „Тры чарапахі”
13	6	46	Н.Р.М., „Чыстая светлая”
14	17	44	Н.Р.М., „Песня падземных жыхароў”
15	20	43	Р.Ф. Брага, „Я”
16	—	42	Ріма, „Дакуль мы будзем”
17	—	36	Н.Р.М., „Бывай”
18	—	35	Кардон, „Айчына”
19	—	35	Пастскрыптум, „Сонейка”
20	15	34	Сінанім, „Не пакінь”

Як галасаваць: песні, якая вам найбольш падабаецца прызнайце 10 балаў, 2 песні — 9 балаў, 3 — 8, 4 — 7, і г.д. аж да 10 песні, якой дайце 1 бал.